ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАЇН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 80 (2029)
5 кастрычніка 1965 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

КРЫЛЫ ДЛЯ ЎЗЛЁТУ

У першыя два дні кастрычніка ў Маскве працавала VI сесія Вярхоўнага Савета СССР шостага склікання.

Выбраннікі народа сабраліся ў знамянальныя дні. Толькі што закончыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС, які засведчыў значныя поспехі Савецкай краіны, дасягнутыя ў ходзе выканання сямігодкі, і разам з тым намеціў новыя шляхі далейшага развіцця і ўмацавання нашай эканомікі. Рашэнні Пленума глыбока хвалююць усіх савецкіх людзей. Пытанні, абмеркаваныя на Пленуме, вызначылі змест работы і сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

У парадак дня сесіі былі аднагалосна ўключаны наступныя пытанні:

1. Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю.

2. Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Па першым пытанні парадку дня — «Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю» з дакладам выступіў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР дэпутат К. Т. Мазураў. Ажыццяўленне выпрацаваных ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР мер па ўздыму прамысловай вытворчасці ў нашай краіне, сказаў К. Т. Мазураў, дасць магчымасць яшчэ паўней раскрыць перад усім светам велізарныя магчымасці і перавагі сацыялістычнай сістэмы гаспадарання. Дакладчык разгортвае перад дэпутатамі шырокую праграму ўздыму сацыялістычнай эканомікі і выказвае ўпэўненасць, што намечаныя мерапрыемствы па ўдасканаленні планавання, паляпшэнню кіравання прамысловасцю і ўзмацненню эканамічнага стымулявання вытворчасці будуць аднадушна адобраны дэпутатамі Вярхоўнага Савета СССР.

Затым на раздзельных пасяджэннях абедзьвюх палат — Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей — пачалося абмеркаванне даклада, якое працягвалася і на наступны дзень.

Другога кастрычніка з заключным словам выступіў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР дэпутат К. Т. Мазураў. Ён паведаміў, што абмеркаванне пытання аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю праходзіла пры вялікай актыўнасці дэпутатаў. Рашэнні верасняўскага Пленума ЦК партыі аб удасканаленні кіраўніцтва народнай гаспадаркай і ўнесеныя Саветам Міністраў СССР прапановы, якія вынікаюць з гэтых рашэнняў, атрымалі ў выступленнях дэпутатаў аднадушнае адабрэнне.

Сесія пераходзіць да прыняцця Закону «Аб змяненні сістэмы органаў кіравання прамысловасцю і пераўтварэнні некаторых іншых органаў дзяржаўнага кіравання». Закон раздзельным галасаваннем па палатах прымаецца аднагалосна.

Затым Вярхоўны Савет СССР аднагалосна прыняў пастанову аб назначэнні намеснікаў Старшыні Савета Міністраў СССР, старшынь Дзяржаўных камітэтаў Савета Міністраў СССР і міністраў СССР.

Дэпутаты пераходзяць да разгляду другога пытання парадку дня — да зацвярджэння Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. З дакладам па гэтым пытанні выступіў сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР дэпутат М. П. Геаргадзе. Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР зацвярджаюцца аднагалосна. Аднагалосна прымаюцца адпаведныя Законы.

Па прапанове Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР дэпутата А. І. Мікаяна сесія аднагалосна выбрала Першага сакратара ЦК КПСС дэпутата Л. І. Брэжнева членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

На гэтым VI сесія Вярхоўнага Савета СССР закончыла сваю работу.

ПЕРШЫ «ДЗЕНЬ НАСТАЎНІКА»

Настаўнік...

Любімы, дарагі сэрцу, ён ёсць у кожнага з нас. І ў кожнага з яго імем звязана першая радасць разгаданай літары, першы ўзлёт крылатай мары, першы самастойны роздум... Чулы і клапатлівы выхавацель, умелы і разумны дарадчык, блізкі і верны сябра,— ён застаецца нашым настаўнікам нават тады, калі школьны званок ужо не кліча нас на ўрок, і нават тады, калі пасерабрацца нашы скроні. Бо ў думках — і ў хвіліны радасці, і ў хвіліны заклапочанасці — мы не-не, ды ўявім сабе знаёмы голас, усмешку, бляск вачэй і нібы чуем яго мудрыя парады, яго словы ўхвалы або строгага папроку...

Вось ён заходзіць у клас, вітаецца, і два-тры дзесяткі вачэй глядзяць яму ў твар, ловяць яго кожнае слова, сочаць за кожным жэстам. Якая велічная, пачэсная гэта справа — сеяць добрае, разумнае, вечнае, і, разам з тым, якая адказная гэта місія — выхоўваць людзей, прыгожых думкамі і справамі, людзей мужных і высакародных — будаўнікоў самага справядлівага грамадства.

Цудоўныя ўсходы даюць зярняты, якімі засяваюць дзіцячыя душы нашы настаўнікі. Прызнаючы іх вялікія заслугі, выключныя вынікі іх руплівай працы, Прэзідыум Вярхоўнага Савета Указам ад 29 верасня пастанавіў штогод святкаваць у першую нядзелю кастрычніка «Дзень настаўніка».

— Гэтая вестка — радасць не толькі для настаўніка. Гэта радасць для ўсёй нашай краіны, у якой настаўнік, гаворачы словамі Ільіча, узняты на такую вышыню, на якой ён ніколі не стаяў, не стаіць і не будзе стаяць у буржуазным грамадстве, — сказала выкладчык сярэдняй школы № 4 г. Мінска заслужаная настаўніца школы БССР Дар'я Кірылаўна Анісімава, якую вы бачыце на здымку, зробленым нашым нарэспандэнтам Ул. Крукам.

Новае маладое свята прыпала сёлета на 3 кастрычніка. Тысячы віншавальных паштовак і пісем прыйшло да гэтага дня на імя настаўнікаў ад іх удзячных вучняў.

Мы таксама з радасцю віншуем настаўнікаў з усенародным прызнаннем іх працы і жадаем новых вялікіх поспехаў.

ДА 50-ГОДДЗЯ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

У Тураўскай занальнай бібліятэцы аформлена пастаянная кніжная вітрына, прысвечаная 50-годдзю Савецкай улады. Тут творы Ул. І. Леніна, напісаныя ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення Кастрычніцкай рэвалюцыі, у першыя гады Савецкай улады, яго прамовы.

Падабраная літаратура расказвае пра Ул. І. Леніна як правадыра Кастрычніка, пра ўстанаўленне і ўмацаванне Савецкай улады ў Беларусі і г. д.

Да знамянальнай даты работнікі бібліятэкі рыхтуюць маляўнічы плакат.

Дэкада беларускай культуры ў Балгарыі

ДРУЖБА — НАВЕЧНА

Свята беларускай культуры на берагах Дуная працягваецца. Усюды на гасцінная зямлі Балгарыі — у гарадах і вёсках, на прадпрыемствах і ў кааператывах праходзяць масавыя сходы і вечары, прысвечаныя жыццю беларускага народа. Шмат дзе адкрыты спецыяльныя фотавыстаўкі, выстаўкі беларускай кнігі, якія прываблiваюць многа наведвальнікаў. Заўсёды шматлюдна на вялікай выстаўцы «Савецкая Беларусь», наладжанай у Сафіі. Фотастэнды тут шырока паказваюць дасягненні Беларусі за гады Савецкай улады, а калекцыя работ народных майстроў — вырабы з дрэва і керамікі, узоры інкрустацыі — расказваюць балгарскім сябрам пра самабытны талент беларускага народа.

Многія навучальныя ўстановы, бібліятэкі наладжваюць літаратурныя чытанні, абмеркаванні кніг беларускіх аўтараў. Балгарскае радыё і тэлебачанне сістэматычна знаёмяць слухачоў і гледачоў з беларускай культурай, з яе лепшымі здабыткамі. Газеты НРБ, адводзячы шмат месца асвятленню Дэкады, публікуюць вершы і прозу беларускіх пісьменнікаў, расказваюць пра культуру і мастацтва Беларусі. Днямі адкрыўся фестываль беларускіх фільмаў, які пачаў падарожжа па многіх гарадах і вёсках Балгарыі.

Выключна сардэчна балгарскія сябры прымаюць дэлегацыю Беларусі на чале са старшынёй Таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі В. Смірновым. Дэлегацыя пабывала ў Кюстэндзілскай акрузе, агледзела выдатныя мясціны Сафіі, а гэтымі днямі сустрэлася з балгарскімі працоўнымі, дзеячамі культуры і мастацтва ў Плоўдзіве, Бургасе і іншых гарадах і сёлах краіны.

Незабыўнае ўражанне пакінула ў беларускіх гасцей наведванне Плоўдзіва. Тут у час знаёмства з горадам члены дэлегацыі ўсклалі кветкі да помніка савецкаму воіну, а затым пабывалі на трактарным заводзе, пабудаваным з дапамогай Савецкага Саюза. На мітынгу, які адбыўся на заводзе ў гонар гасцей, выступіў дырэктар прадпрыемства Х. Мінкаў.

У Бургасе пасланцы беларускага народа пабывалі ў гасцях у калектыву электракабельнага завода імя В. Каларава, сустрэліся з рабочымі нафтахімічнага камбіната. Вечарам у горадзе адбыўся ўрачысты сход, на якім выступілі кіраўнік дэлегацыі беларускіх дзеячоў культуры В. Смірноў і балгарскія таварышы.

З вялікім поспехам працягваюць выступаць перад шырокай балгарскай публікай артысты БССР, якія госцяць у Балгарыі. Яны паказалі ўжо сваё майстэрства ў Плевене, Сафіі і іншых гарадах. Радасна прынялі дзеячоў мастацтва Беларусі ў старажытнай балгарскай сталіцы Вяліка-Тырнова. Тут у Летнім тэатры сабралася некалькі тысяч гледачоў, якія ўзнагародзілі майстроў опернага, балетнага і эстраднага мастацтва Беларусі гарачымі апладысментамі.

Дарагіх беларускіх гасцей з нецярплівасцю чакаюць у Габраве, Ловічы і іншых гарадах і сёлах краіны. Карэспандэнт ТАСС пабываў у працоўнай кааператыўнай земляробчай гаспадарцы «Боцеўградская камуна», якая вось ужо тры гады ў вялікай дружбе з магілёўскім калгасам «Рассвет». Старшыня ПКЗГ Васіл Цанкаў паведаміў, што кааператары рыхтуюцца ўрачыста сустрэць беларускую дэлегацыю, паказаць ёй сваю гаспадарку, перадаць праз яе гарачае прывітанне сваім беларускім сябрам-хлебаробам.

Дэкада беларускай культуры праходзіць з вялікім уздымам і дэманструе непарушную брацкую балгара-савецкую дружбу.

Па матэрыялах ТАСС.

ЮБІЛЕЙНЫ СЕЗОН

2 кастрычніка спектаклем П. Чараднічэнкі «Дачка Расіі» Гродзенскі абласны рускі драматычны тэатр адкрыў свой юбілейны — 20-ы сезон. Ролю заснавальніка навуковага камунізма Карла Маркса выконвае заслужаны артыст БССР Я. Кімберг, Фрыдрыха Энгельса—артыст В. Дземін. У цэнтральнай ролі рускай рэвалюцыянеркі Лізаветы Таманоўскай—артыстка Л. Сторажава.

Перад пачаткам прадстаўлення сакратар абкома партыі А. І. Ульяновіч павіншаваў артыстаў і ўсіх работнікаў тэатра з 20-годдзем з дня стварэння калектыву і пачаткам новага сезона. Дырэктар тэатра І. Міхалюта расказаў прысутным аб пройдзеным калектывам шляху, падзяліўся планамі на будучыню.

У новым сезоне мастацкі тэатр пакажа гледачам спектакль па п'есе А. Штэйна «Паміж ліўнямі». Пастаноўка будзе прысвечана 50-годдзю Савецкай улады. Да гэтай знамянальнай даты вырашана паставіць і «Сэрца на далоні» І. Шамякіна.

У рэпертуарны план уключаны таксама п'есы «Абуджанае сумленне» В. Шаўрына, «Ноч перад неўміручасцю» Н. Курульчука і Е. Курцяка, «Гібель паэта» В. Салаўёва і «Лінія жыцця» М. Гарулёва.

БЕЛТА.

НА ПАЛІЦАХ — ПАЛІТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА

Работнікі кніжнага магазіна № 11 г. Мінска праводзяць Дэкаду палітычнай літаратуры. На паліцах выстаўлена многа кніг, брашур, даведнікаў, якія расказваюць аб Кастрычніцкай рэвалюцыі, пабудове сацыялізма ў нашай краіне, аб палітычным і грамадскім ладзе ў братніх краінах. Вялікім попытам карыстаюцца ў наведвальнікаў працы класікаў марксізма-ленінізма, кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. За пяць дзён дэкады магазін наведалі тысячы працоўных сталіцы.

БЕЛАРУСЬ АРХІТЭКТУРНАЯ



ІНСТЫТУТ УДАСКАНАЛЕННЯ НАСТАЎНІКАЎ. (Праект).

Малюнак архітэктара Э. ВІШНЕЎСКАЙ.

КУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР ПЕДАГОГАЎ

Гэтая велізарная шкляная «скрынка» стане сярод зеляніны непадалёку ад Свіслачы, на Ульянаўскай вуліцы ў квартале паміж вуліцамі Леніна і Энгельса. Старыя драўляныя дамы, якія стаяць тут сёння, знясуць і паставяць гэтае лёгкае і прыгожае збудаванне. Тут будзе Інстытут удасканалення настаўнікаў. Праект распрацоўваецца ў «Белдзяржпраекце» архітэктарам Л. Гальштэйнам і інжынерам Г. Лур'е.

Праекціроўшчыкі прапануюць зрабіць квадратны будынак на тры паверхі з унутраным двароам. Кожны бок дома будзе даўжынёю ў 60 метраў. Каб гарызанталь зрокава не выглядала занадта доўгай, аўтары прапанавалі даць па фасадах вертыкальныя стужкавыя вокны. З боку парку першага паверха часткова не будзе — другі ж і трэці будуць трымацца на слупах. Такое рашэнне дазволіць звязаць унутраны двор будынка з навакольнай прыродай, пазбавіць яго замкнёнасці. Ва ўнутраны двор, у якім будзе дэкаратыўны сад з фантанам, раскрыюцца сумежныя з ім фае актавай залы, вестыбюль, холы — іх будзе аддзяляць ад вонкавага асяроддзя толькі вітрыннае шкло. Гэта створыць у пакоях адчуванне прасторы.

У новым будынку запланаваны цэлы комплекс памяшканняў разнастайнага прызначэння: актавая і спартыўныя залы, бібліятэка, буфет, зала для заняткаў харэаграфіяй, пакоі для індывідуальнай работы, лекцыйныя аўдыторыі. Гэта будзе культурны цэнтр настаўнікаў рэспублікі. Тут педагогі змогуць не толькі вучыцца, павышаць свой агульна-адукацыйны і прафесіянальны ўзровень, але і збірацца на свае нарады, сходы, займацца ў гуртках мастацкай самадзейнасці.

Інтэр'еры дома будуць вырашаны па-сучаснаму, тут будуць выкарыстаны навейшыя будаўнічыя і аздабляльныя матэрыялы. У перспектыве ля Інстытута ўдасканалення настаўнікаў мяркуецца пабудаваць крыты плавальны басейн.

ДЫСКУСІІ
На парадку дня:
ПРАБЛЕМЫ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

ПЫТАННІ — РОЗНЫЯ, КЛОПАТ — АДЗІН

Гэтую сустрэчу, бадай, нельга назваць канферэнцыяй па пытаннях развіцця беларускай дзіцячай літаратуры — калі пад канферэнцыяй разумець загадзя і старанна падрыхтаваны сход з трыбунай, дакладчыкамі, са строгім рэгламентам. Гэта была проста гутарка — шчырая, зацікаўленая. Яна адбылася па ініцыятыве рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» і Уздзенскай дзіцячай бібліятэкі ў сярэдняй школе гарадскога пасёлка Узда. У ёй прынялі ўдзел настаўнікі сярэдняй школы і школы-інтэрната, бібліятэкары, вучні старэйшых класаў. Думаецца, што многія выказванні і меркаванні ўдзельнікаў гэтай сустрэчы варты таго, каб быць апублікаванымі.

Запіс гаворкі, якая адбылася ў Уздзе, зрабіў наш спецыяльны карэспандэнт **М. Гілевіч.**

ТОЕ, аб чым зараз ідзе гаворка на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» — я маю на ўвазе дыскусію аб праблемах развіцця беларускай дзіцячай літаратуры, — мае непасрэднае дачыненне і да нас, бібліятэкараў і настаўнікаў, — пачаў гаворку загадчык Уздзенскай дзіцячай бібліятэкі **Д. Слаўковіч.** — Нам ёсць што сказаць, у кожнага з нас за гады працы сабраліся і пэўныя думкі, і пэўныя назіранні. Вось давайце і падзелімся імі, шчыра пагаворым аб тым, што нас хвалюе, трывожыць. Такі абмен думкамі будзе карысны перш-наперш нам самім — ён паможа нам у высакароднай справе выхавання падрастаючага пакалення.

Гаворка аб праблемах развіцця дзіцячай літаратуры ахоплівае шырокае кола пытанняў як тэарэтычнага, так і практычнага, арганізацыйнага парадку. І нам тут, мусіць, не трэба асабліва залазіць у тэарэтычныя «трушчобы», адбіраць хлеб у прафесіянальных крытыкаў, нам лепш сур'ёзна пагаварыць аб практычных пытаннях, звязаных з нашай працай, пагаварыць аб тым, што нам бліжэй.

Дзеці чытаюць вельмі шмат. Яны з самага маленства горнуцца да кнігі. Гэта радасная з'ява... Вось яны прыходзяць у бібліятэку, патрабуюць кнігу. Што яны просяць? Адны — «дайце пачытаць што-небудзь», проста — «што-небудзь». Другія — «што-небудзь цікавае». Трэція называюць пэўную кнігу, аб якой ужо ад некага чулі. Вось тут і пачынаюцца для бібліятэкара цяжкасці. Якія?

Кніжная гаспадарка ў нас вялікая. Я маю на ўвазе не толькі гаспадарку канкрэтна нашай бібліятэкі, а ўвогуле — літаратуру для дзяцей, у тым ліку і беларускую. Сёння беларуская дзіцячая літаратура надзвычай багатая, асабліва літаратура для маленькіх. Штогод для самых малых чытачоў выходзіць некалькі дзесяткаў кніжак — казак, вершаў, апавяданняў. Нямала кніжак адрасуецца дзецям сярэдняга і старэйшага ўзросту. Здавалася б, выбар вялікі. Аднак...

Прыходзіць, напрыклад, хлапчук і просіць кнігу пра... шпіёнаў. Я разумею яго: дзеці заўсёды цягнуцца да нечага незвычайнага, займальнага, гераічнага. І хто вінаваты, што часта гэтае гераічнае, незвычайнае асацыіруецца ў дзіцяці з так званымі «шпіёнскімі» кніжкамі? Сапраўды, лягчэй напісаць займальную кніжку пра «шпіёна» ці «шкодніка», чым знайсці займальнасць у звычайным жыцці дзяцей. Але ж затое і ўдзячнасць чытача, і карысць ад сапраўды займальнай кніжкі будуць невымерныя. Не магу ў гэтай сувязі не ўспомніць «Вайны каля Цітавай копанкі» Івана Навуменкі. Кніга гэтая вартая самай лепшай пахвалы. Я кажу гэта ад імя ўсіх нашых чытачоў.

Дзецям патрэбна прыгодніцкая кніга. Але ж, безумоўна, прыгоды ў ёй не павінны быць дзеля саміх прыгод. Прыгодніцкая кніга павінна мець вялікі маральны, выхаваўчы змест. На жаль, я не магу сказаць гэта пра многія кнігі гэтага жанру нашых беларускіх пісьменнікаў, у прыватнасці, пра кнігі М. Ваданосава і А. Шашкова. І «Лань — рака лясная», і «Пабярэжцы», і «Апошні вадзянік» — усе гэтыя аповесці, я б сказаў, залішне лёгкадумныя. Растлумачыць жа гэта дзецям нялёгка, бо часам сябрукова заўвага «Сіла!» значыць для хлапчука больш, чым довады бібліятэкара.

І тут мне хочацца зрабіць адзін папрок вам, таварышы настаўнікі. Вы наладжваеце ў школах канферэнцыі, дыспуты, абмеркаванні тых ці іншых кніг. Гэта добрая справа. Аднак вам трэба быць больш, як тут сказаць, актыўнымі ці што. А то што ж назіраецца? Дзесятак год запар абмяркоўваецца адна і тая ж, няхай сабе і добрая, кніжка. А штогод выходзіць нямала іншых, не горшых. Чаму ж на іх не звярнуць увагу, навошта абмяркоўваць даўно абмеркаваную? Чаму, напрыклад, не пагаварыць з дзецьмі аб той жа кнізе І. Навуменкі? Ваша настаўніцкае слова для дзяцей вельмі шмат значыць. І ў гэтым сэнсе вы можаце аказаць нам, бібліятэкарам, велізарную дапамогу.

Магчыма, я адхіліўся ад тэмы гаворкі, аднак мне здаецца, што ўсё гэта важна.

Некалькі слоў аб навуковай фантастыцы. У беларускай дзіцячай літаратуры гэта самае балючае месца. Па-першае, кніг навуковай фантастыкі вельмі і вельмі мала. Па-другое, тое, што ёсць, не задавальняе яшчэ нашых чытачоў. Я не хачу сказаць, што дзеці не чытаюць «Шосты акіян» М. Гамолкі альбо «Апошнюю арбіту» Ул. Шыціка. Але прыкметнага следу ў душы чытачоў кнігі гэтыя не пакідаюць. «Шосты акіян» шасцікласнікі чытаюць, некаторыя нават з захапленнем, а ўжо васьмікласнікі — крывяцца: маўляў, задужа дзіцячая. Думаю, што гэта сур'ёзны папрок пісьменніку.

Або возьмем такое пытанне, як «павучальнасць» дзіцячай кнігі. Удзельнікі дыскусіі на старонках «Літаратуры і мастацтва», думаецца, зусім справядліва абураліся тым, што нярэдка кніжкі для дзяцей залішне дыдактычныя, што ў іх пануе голая павучальнасць. Сапраўды, такая кніжка не будзе карыстацца поспехам сярод малых чытачоў. Дзеці не любяць, калі іх на кожным кроку павучаюць, прыніжаючы тым самым іх чалавечую годнасць. Я заўсёды стараюся даведацца, ці спадабалася таму ці іншаму чытачу прачытаная ім кніжка. Спытаю, а хлапчук рукою махне ды і скажа: «Ат, я і так ведаю, што дрэўцаў ламаць нельга...». Пагартаю пасля сам тую кніжку і пераконваюся: правільна гаварыў хлапчук — акрамя прапісных ісцін, у кнізе амаль нічога няма.

Хочацца хоць коратка сказаць тут і аб тэматыцы нашых кніг для дзяцей. Аб чым часцей за ўсё пішуць пісьменнікі? Аб тым, як гарадскі хлопчык упершыню прыязджае ў вёску, як вучні праводзяць канікулы і якія прыгоды з імі адараюцца, як добры ўвогуле хлопчык трапляе пад уплыў хулігана ці злодзея, а пасля выпраўляецца, і г. д. А дзеці хочуць ведаць усё, літаральна ўсе. І гэтую прагавітасць дзяцей да ведаў павінны ўлічваць у сваёй рабоце нашы пісьменнікі.

— Дазвольце мне, — як на ўроку, падняла руку вучаніца 10 класа **Святлана Ляневіч.** — Даір Фёдаравіч гаварыў аб вялікай кніжнай гаспадарцы. Сапраўды, кніг у нас шмат. Шмат і добрых. Вазьміце адны толькі кнігі Янкі Маўра і Міхася Лынькова! Гэта ж цэлая бібліятэка! Я, калі і меншай была, і цяпер, як час выпадае, з задавальненнем чытаю і перачытваю кнігі гэтых пісьменнікаў. Але ж кніг для дзяцей мала. Мы сапраўды хочам ведаць усё, знайсці ў кнігах адказы на ўсе нашы пытанні. А многія кніжкі такіх адказаў не даюць. Тут успаміналі «Лань — раку лясную». Гэтую кніжку Алеся Шашкова, а таксама яго ж «Белы камень» я калісьці чытала. Але не магу сказаць, што яны мяне ўзрушылі. Бо вось жа сядзела тут, старалася прыпомніць, што ў тых кніжках было, і амаль нічога не ўспомніла. Нават ніводнага героя кнігі не ўспомніла. А з кніг Маўра памятаю і Віктара з Міронам, і Манга, і першую ўсмешку чалавека, і многае іншае.

Што яшчэ хочацца сказаць? Тры гады я была важатай у акцябрат. Часта чытала ім «Вясёлку». Казкі ім падабалася слухаць, кароценькія апавяданні-смяшынкі — таксама. А вось вершы не вельмі слухалі. Асабліва калі доўгі верш трапляўся. Пачну чытаць, колькі радкоў прачытаю, а пасля бачу — слухачы мае чымсьці заняліся. Злавалася я тады. А цяперашнім розумам дык разумею, што тыя вершы не надта цікавыя.

І апошняе. Чаму малымі тыражамі выпускаюць кнігі нашы выдавецтвы? Заўсёды адно і тое ж: дзе дастаць патрэбную кнігу. Асабліва праграмную. Вось мы цяпер праходзім Лынькова, а кніг яго нідзе няма: ні ў бібліятэцы, ні ў магазіне...

— Святлана правільна сказала, — гаворыць **В. Журыд,** заслужаны бібліятэкар рэспублікі, загадчык школьнай бібліятэкі. — Тыражы нашых кніг малыя. І гэта датычыцца не толькі праграмных твораў. Возьмем любую дзіцячую кніжку. Які яе тыраж? 8—10—16 тысяч экземпляраў. А колькі ў нас школьных і дзіцячых бібліятэк? А індывідуальны пакупнік?..

— Наконт тыражоў і ў мяне ёсць адна заўвага, — дадае Д. Слаўковіч. — Час ад часу ў нас выходзяць шматтомныя выданні класікаў — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Кандрата Крапівы. Колькі камплектаў можа набыць дзіцячая бібліятэка? Толькі адзін-два. Больш сродкі нашы не дазваляюць. А чаму б часцей не выдаваць аднатомнікі выбраных твораў, спецыяльна для дзяцей і школьнікаў? Замест аднаго-двух шматтомнікаў можна было б набыць дзесятак-паўтара кніг. І попыт на іх быў бы лёгка задаволены.

— Я таксама хачу зрабіць некалькі практычных заўваг, — гаворыць бібліятэкар школы **І. Сулер.** — Я працую з малодшымі класамі. Тут з беларускай кнігай ёсць пэўныя цяжкасці. Справа ў тым, што беларускую мову нашы дзеці пачынаюць вывучаць з трэцяга класа. Таму першакласнікі і другакласнікі па сутнасці не могуць чытаць кніг на роднай мове. Праўда, яны ўсё ж чытаюць, бо дома і па-за школай размаўляюць пераважна па-беларуску. Але я не лічу разумнай пастанову — вучыць родную мову з трэцяга класа, тым больш у такіх школах, як наша, уздзенская, дзе пераважная большасць насельніцтва гаворыць па-беларуску. Родную мову трэба вывучаць з першага класа, з першага класа дзеці павінны прывыкаць да кніг на роднай мове.

Некалькі слоў пра ілюстрацыю да дзіцячай кнігі. Кніга для дзяцей не павінна быць без малюнкаў, бо малюнак для малых значыць часам нават больш, чым тэкст. А кніжкі без ілюстрацый, хоць у апошні час і рэдка, аднак выходзяць. Галоўнае ж — якасць ілюстрацый. Вельмі часта яны зроблены проста неахайна. Кніжка выглядае шэрай, аднастайнай. Яна не прываблівае дзіця.

Варта таксама падумаць над фарматам дзіцячых кніг. У прыватнасці, многія казкі для маленькіх выдаюцца такім вялікім фарматам, што не лезуць у дзіцячыя партфелікі альбо сумкі, дзеці носяць іх у руках, ад чаго кніжкі хутка рвуцца.

Ну і, безумоўна, лепшай павінна быць прапаганда кнігі — і дарослай, і дзіцячай. Дзіўная рэч атрымліваецца: у бібліятэках і магазінах кніга на роднай мове чамусьці заўсёды на другім плане. А ці не павінна быць наадварот?

— Іда Вігдараўна, — азваўся зноў Д. Слаўковіч, — варта нагадаць і пра вокладкі дзіцячых кніг. Вы і я добра ведаем, як хутка дзяруцца кнігі для дзяцей. Прачытаюць іх трое-пяцёра чытачоў і ад кнігі застаюцца пашматаныя старонкі. Вокладкі кніг для дзяцей павінны быць цвёрдымі, моцнымі. Гэта — дробязь, але дробязь важная.

— Аб адной важнай «дробязі» хочацца сказаць і мне, — пачаў настаўнік **Я. Чарэнда.** — Маю на ўвазе кніжкі аб прыродзе роднага краю. Значэнне іх у выхаванні чалавека цяжка пераацаніць. Менавіта ж з любасці, з замілавання да роднай прыроды пачынаецца вялікае пачуццё патрыятызму. Дзеці нашы захапляюцца розным — часам добрым, часам дрэнным. А вось ці часта бачылі мы, каб хлопчыкі ці дзяўчаткі захапляліся хараством навакольнай прыроды, ашчадна ставіліся да маладых дрэўцаў? Не, не часта. І гэта не можа не выклікаць трывогі. Вінаваты і мы настаўнікі, і пісьменнікі, ды і таварышы з Міністэрства асветы.

Возьмем нашы чытанкі і хрэстаматыі. У іх вельмі мала твораў аб харастве і багацці прыроды роднага краю. А тое, што ёсць, часта не лепшае. Горш таго, часам мы і гэтага не выкарыстоўваем як след. Вось факт. Аднойчы ў часе экскурсіі, на прывале, я пачаў чытаць вучням урыўкі з «Новай зямлі» Якуба Коласа, яго цудоўныя малюнкі родных краявідаў. Мяне слухалі з захапленнем. Я здзівіўся: «Няўжо вы не чулі гэтых вершаў?» — «Не, не чулі». — «А «Новую зямлю» праходзілі?» — «Праходзілі».

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ТЭАТР

БЫЦЬ ПРАЎДЗЕ НА ЗЯМЛІ

...Проста з глядзельнай залы шырокім, размашыстым крокам ідзе на сцэну сярэдніх гадоў чалавек. Ён — у салдацкай гімнасцёрцы пад паношаным пінжаком, у кірзавых ботах. Гэта—Марка Бяссмертны, галоўны герой драмы Міхайлы Стэльмаха «Праўда і крыўда», пастаўленай у Тэатры імя Якуба Коласа.

Так пачынаецца ў коласаўцаў новы спектакль. Спачатку нават узнікае думка: ці не чарговы гэта чыста знешні рэжысёрскі прыём, закліканы ўразіць гледача нечаканасцю?.. Здараецца ж часам, што сцэнічны штамп нам спрабуюць выдаць за арыгінальнасць.

Аднак з пачаткам развіцця падзей гэтая насцярожанасць паступова змяняецца зацікаўленасцю да таго, што адбываецца на сцэне.

П'еса М. Стэльмаха, створаная па яго аднайменнаму раману, расказвае пра падзеі, якія заўсёды хвалююць нас сваёй велічнасцю: вядомы ўкраінскі пісьменнік смела, рашуча, без сентыментальнасці і без лакіроўкі вядзе размову пра добрых працавітых людзей зямлі савецкай, якія ў складаных умовах ваеннага ліхалецця кармілі хлебам фронт.

Пакалечаныя фізічна, але моцныя духам былыя франтавікі, вярнуўшыся да родных мясцін, адбудоўваюць разбураную вайною калгасную гаспадарку. Не ўсё ідзе гладка ў Марка Бяссмертнага (артыст М. Звездачотаў), калі ён прыехаў ў родную вёску з фронту пасля цяжкага, амаль смяртэльнага ранення. У пралогу спектакля, з якога мы пачалі гаворку, і паказана, як Марка вока на вока сустрэўся са Смерцю і перамог яе сваёй адданай любоўю да роднага, абязздоленага вайной краю.

Старшыня калгаса Безбародзька (Ф. Шмакаў) разам са сваімі сябрукамі — загадчыкам гаспадаркі Шавулам (Т. Кокштыс) і кладаўшчыком Мамурам (А. Лапо) сістэматычна расцягваюць грамадскае дабро, здзекуюцца з працаўнікоў спаленай фашыстамі калгаснай вёскі.

Нялёгка яму, Марку Бяссмертнаму, абяззброіць закаранелых, спрактыкаваных круцялёў і прыстасавальцаў. Барацьба ўскладняецца яшчэ і тым, што Безбародзьку падтрымлівае кар'ерыст і дэмагог — намеснік старшыні райвыканкома Кісель (Б. Левін).

На першы погляд, канфлікт знаёмы. Ён часта сустракаецца ў нашай драматургіі. Але ў дадзеным выпадку справа не столькі ў тым, што Бяссмертны перамагае Безбародзьку, займае яго пасаду. Перыпетыі барацьбы Бяссмертнага і Безбародзькі — як бы толькі «зачэпка» для стварэння на сцэне шырокай эпічнай карціны барацьбы за Праўду на зямлі. Аўтар п'есы і тэатр (рэжысёр А. Падабед) адвечную варожасць двух процілеглых пачаткаў чалавечага існавання—Праўды і Крыўды—пераносяць у сферу філасофскага роздуму пра жыццё, пра ўзаемаадносіны паміж людзьмі.

Мабыць, для таго, каб падкрэсліць філасофскі план размовы, пастаноўшчык уводзіць у спектакль дзве «асобы ад тэатра» — Праўду (М. Марозава) і Крыўду (Я. Яленская). Яны то відочна, то непрыкметна прысутнічаюць на сцэне, сімвалізуючы непрымірымасць барацьбы. Але ў той жа час нельга змоўчаць пра тое, што некаторая ўмоўнасць сцэнічнага вырашэння гэтых «асоб ад тэатра» часам адцягвае нашу ўвагу ад канкрэтных жыццёвых сутыкненняў, ад рэальнасці быцця персанажаў.

Частыя пераходы ад жывых перажыванняў да ўяўленняў аб мінулым, аб падзеях, якія ўспамінаюцца таму ці іншаму персанажу, ускладняюць і без таго складаную творчую задачу калектыву. І калі на службе ў мастака (афармленне Я. Нікалаева) — сучаснае асвятленне (дарэчы, у новым будынку Віцебскага тэатра яно вырашана тэхнічна бездакорна), праецыя на экран і заднік, мноства фарбаў і г. д., то ў акцёраў усё тыя ж традыцыйныя сродкі—голас, тэмперамент, пластыка.

Заслуга рэжысёра, на нашу думку, перш за ўсё ў тым, што ў большасці выпадкаў яму ўдалося аб'яднаць усе кампаненты спектакля ў адзіным мастацкім вобразе, стварыць сапраўднае тэатральнае відовішча, напоўненае пафасам сцвярджэння і аптымізму.

Сцэна спаткання Маркі Бяссмертнага са сваімі крыўдзіцелямі Кісялём і Чарнаволенкам (следчы Чарнаволенка дапытваў Марка ў 1937 годзе) з гэтага пункту погляду найбольш выразная.

На прыцемненай сцэне стаіць Марка. Пад гукі барабаннага пошчаку да яго з двух бакоў набліжаюцца Кісель і Чарнаволенка (І. Вашкевіч). Следчы прапануе падпісаць пратакол, які яшчэ не складзены. Марка падпісвае чысты ліст паперы. На экране паказваецца стос папак-спраў. Злавесныя фігуры ўсё пад тую ж барабанную музыку адыходзяць за экран, на якім ужо з'явілася падножжа знаёмага манумента, а побач маленькія цені Чарнаволенкі і Кісяля.

Там, дзе акцёры-выканаўцы глыбока зразумелі сутнасць вобразаў, адчулі грань паміж жыццёвай праўдай і мастацкім уяўленнем аб гэтай праўдзе, — іх голас, дзеянні хвалююць нас, яны зліваюцца з агульным сцэнічным вобразам пастаноўкі.

Марка Бяссмертны, напрыклад, фігура ў некаторай ступені сімвалічная. Пра гэта сведчыць нават яго прозвішча. Але разам з тым ён жывы чалавек, надзелены канкрэтным характарам, звычкамі. Артыст М. Звездачотаў прыклаў нямала намаганняў, каб пераадолець крыху нязвыклы для яго індывідуальнасці драматычны матэрыял. Ён шчыры, праўдзівы, вельмі звычайны чалавек. Яму вераць аднавяскоўцы, яго любяць сябры. Сапраўды па-майстэрску праводзіць артыст сцэну з Маўрай (З. Канапелька).

Цяжкая доля дасталася Маўры Пакрытчанка. Яна маладой аўдавела, засталася без гаспадара і дарадцы ў доме. Замест дапамогі старшыня калгаса Безбародзька выкарыстоўвае яе становішча ў сваіх эгаістычных мэтах. Марка, зайшоўшы да яе дамоў, застаў удаву ў самым крытычным становішчы: Маўра чакае дзіця ад Безбародзькі, які дэманстратыўна адмаўляецца ад бацькоўства.

Цярпліва і шчыра гаворыць Марка з маладой калгасніцай. Яго добрыя вочы, цёплыя словы супакойваюць удаву. «Калі бацька адмаўляецца, — кажа ён са шчырасцю да будучай маці, — запішы дзіця на маё імя...». Прыкра толькі, што артыстка З. Канапелька занадта аднастайна «перажывае» сваё гора. Залішняя слязлівасць здрабняе вобраз, змяншае яго мастацкую пераканаўчасць у спектаклі.

З рознымі людзьмі сустракаецца Марка ў час свайго вандравання па зямлі. Яму давялося бачыць «жывую смерць». Не абмінулі яго і «мёртвыя людзі».

Найбольш запамінальнай і важнай для яго будучага лёсу была сустрэча ў райкоме партыі са сваімі ідэйнымі і фактычнымі ворагамі — Кісялём і Безбародзькам.

Марку выклікалі на пасяджэнне бюро ў сувязі з інцыдэнтам з Безбародзькам (надоечы Бяссмертны пад пагрозай пісталета прымусіў старшыню залезці ў ледзяную ваду замочваць канопліі, убачыўшы, як той заганяў туды калгаснік).

Скажам адразу — сцэна гэта не знайшла ў тэатры належнага вырашэння. Прычыны тут можна шукаць і ў дэкларатыўнасці вобраза Кісяля (артысту Б. Левіну не хапае перакананасці ў сваіх словах, у дзеяннях), і ў сузіральнасці паводзін сакратара райкома Барысенкі. Праўда, трэба сказаць, што ў спектаклі, які я глядзеў, артыст П. Бялевіч уведзены быў на гэтую ролю з адной рэпетыцыі. Можна спаслацца тут на пэўную пасіўнасць дзеяння Маркі і яго друга Заднепроўскага (яўна паскупіўся драматург на дзейсныя словы для гэтых персанажаў) і на дынамічнасць Безбародзькі. Дарэчы, як у гэтай сцэне, так і ў многіх іншых артыст Ф. Шмакаў вельмі каларытны па ўнутранаму і знешняму малюнку ролі.

Не вырашаны і выяўленчы бок сцэны ў райкоме партыі, хаця ўвогуле работа Я. Нікалаева заслугоўвае пахвалы.

Сцэна пасяджэння ў райкоме, дзе Бяссмертны рэкамендуецца старшынёй калгаса замест Безбародзькі — кульмінацыйная ў развіцці драматургічнай калізіі п'есы. Зразумела, што недастаткова яскравае яе вырашэнне прыводзіць да спаду дынамікі сцэнічнага дзеяння. А ў пастаноўцы ж ёсць некалькі ўражлівых дынамічных сцэн. Надзвычай лаканічна і выразна пастаўлена сцэна перамогі.

...З глыбіні сцэны вырываецца вясковы хлопчык Федзька (артыстка Н. Левашова) і з радасным воклічам «Перамога!» праносіцца праз глядзельную залу. Услед, пад гукі ўрачыстай музыкі і званоў, на падмосткі ўзнімаецца Праўда з чырвоным сцягам у суправаджэнні воіна-пераможцы.

Пераканаўча гучыць і фінал спектакля.

Але ўсё гэта асобныя эпізоды — справядлівасць патрабуе сказаць, што драма занадта раздробленая, ёй не хапае кампактнасці, яна не заўсёды падпарадкоўваецца адзінаму рытму, скразному дзеянню спектакля.

Як ужо гаварылася, пастаноўка А. Падабеда падкрэслена паэтычная, з выкарыстаннем элементаў рамантыкі, патэтыкі. Што патрабуецца ад акцёраў? Перш за ўсё адчуць мяжу паміж бытавой канкрэтнасцю і ўзнёсласцю думак, умець нават праз цяжкі быт людзей раскрыць багацце і хараство іх душы, іх веру ў будучае.

Цяжка ўявіць сабе больш жыццёва верагодны вобраз, чымся Ганна Бяссмертная, маці Маркі, у выкананні Я. Лагоўскай. Сустрэча з сынам, на якога прыйшла ўжо пахавальная, кранае да слёз. Шчырасць перажыванняў старой, забітай горам калгасніцы захапляюць у ігры артысткі. У іншым спектаклі гэта было б выдатна. У гэтым — толькі добра. Чаму? Бо рэжысёр увесь час настойліва даводзіць гледачу паэзію жыцця, аптымізм савецкіх людзей, без якога яны не змаглі б адолець тое, што адолелі. Артыстка ж, у дадзеным выпадку несвядома, залішнім падкрэсліваннем гаротнасці становішча сваёй гераіні, знімае намаганні пастаноўшчыка да мінімуму.

Можа здацца трохі дзіўным, што найбольш салідарны з пастаноўшчыкам кампазітар Б. Магаліф. Ён удала спалучае гучанне магнітафоннага запісу і гучанне жывога аркестра (у адпаведнасці са зместам падзей), умела выкарыстоўвае музычны лейтматыў (песня Сцепаніды).

У перамозе Праўды над Крыўдай, якую сімвалізуе спектакль, мы бачым жывое ўвасабленне сілы нашага жыцця, непераможнасць камуністычных ідэалаў.

А. ЛАБОВІЧ.

РАСЦЕ ТВОРЧАЯ АКТЫЎНАСЦЬ

СА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧАГА СХОДУ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

«Мост» Івана Шамякіна, «Мёртвым не баліць» Васіля Быкава, новыя раздзелы «Подыху навальніцы» Івана Мележа, «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча, «Пакуль не развіднела» Барыса Сачанкі... Нават калі пералічваць найбольш значныя празаічныя творы з тых, што напісаны за апошні час, атрымаецца доўгі спіс. Яшчэ даўжэйшы спіс будзе мець паэзія, нават пры ўмове «якаснага» адбору.

Пра гэта гаварыў на справаздачна-выбарчым партыйным сходзе Саюза пісьменнікаў Беларусі, які адбыўся днямі, сакратар партыйнай арганізацыі Іван Грамовіч.

Дакладчык адзначыў плённую работу беларускіх літаратараў, не толькі колькасны, але і якасны рост літаратуры, павелічэнне ўвагі пісьменнікаў да актуальных тэм нашага жыцця. Дакладчык называе тут, у прыватнасці, «Зямныя вузлы» Ігната Дуброўскага. Гэты праўдзівы нарыс, у якім дакументальнасць спалучаецца з мастацкасцю, закранае многія з праблем, на якіх засяродзіў увагу сельскіх працаўнікоў сакавіцкі Пленум партыі.

Асобна спыняецца дакладчык на пытаннях прапаганды беларускай літаратуры, на рабоце рэдакцый перыядычных выданняў Саюза пісьменнікаў.

Дакладчык гаворыць пра маральны абавязак кожнага пісьменніка сустрэць новымі творамі знамянальныя даты — 50-годдзе Савецкай улады і 100-годдзе з дня нараджэння Ул. І. Леніна.

У спрэчках выступілі Я. Герцовіч, В. Бурносаў, А. Міронаў, М. Аляксееў, Г. Бураўкін, Л. Шапіра, П. Броўка.

Адбыліся выбары новага складу партбюро. У яго ўвайшлі А. Алешка, М. Аляксееў, П. Броўка, Г. Бураўкін, І. Грамовіч, П. Кавалёў, А. Кулакоўскі, І. Мележ, Г. Папоў, Я. Скрыган. Сакратаром партбюро абраны тав. І. Грамовіч.

Новы магазін культтавараў адкрыты ў пасёлку Самахвалавічы Мінскага раёна. Аматары кнігі знойдуць тут навінкі літаратуры, удзельнікі мастацкай самадзейнасці— розныя музычныя інструменты. Загадчыца магазіна Раіса Сяргееўна Шыцікава ўважліва абслугоўвае пакупнікоў.

Фота Ул. КАШКАНА.

КУРС НА РЫГУ

Тэатральнае лета ў Гомелі закончылася гастролямі рэспубліканскага тэатра юнага гледача. Працоўныя горада і вобласці пазнаёміліся са спектаклямі «Марат Казей», «Ганарліўка», «Яны і мы», «Любіць — не любіць» і іншымі. За паспяховае абслугоўванне рабочых і калгаснікаў Гомельшчыны калектыў тэатра ўзнагароджаны Ганаровай граматай аблвыканкома.

Днямі Тэатр юнага гледача выязджае на гастролі ў братнюю Латвію. Рыжане пазнаёмяцца са спектаклем «Марат Казей» па п'есе В. Зуба.

ГОСЦІ КРЫЧАЎСКАГА МУЗЕЯ

Днямі Крычаўскі краязнаўчы музей наведала група масноўскіх пісьменнікаў. Сярод іх — даўні сябра нашага музея Канстанцін Міхайлавіч Сіманаў, пісьменнік Яўгеній Вараб'ёў і вядомы савецкі журналіст Генрых Баравік. К. М. Сіманаў, уважліва агледзеўшы экспазіцыю музея і праслухаўшы тлумачэнні, абяцаў перадаць нам рад сваіх матэрыялаў, звязаных з гісторыяй баёў на Беларусі ў 1941 годзе і перыяду баёў за вызваленне нашай рэспублікі.

Яўгеній Вараб'ёў, які працуе над кнігай пра легендарнага савецкага разведчыка Льва Маневіча, ураджэнца Чавусаў, пазнаёміўся з радам невядомых шырокім колам чытачоў фатаграфій Маневіча і матэрыяламі пра яго юнацтва. Музей перадаў пісьменніку копіі гэтых матэрыялаў. Я. Вараб'ёў, у сваю чаргу, абяцаў таксама падзяліцца з музеем матэрыяламі пра Л. Я. Маневіча.

М. МЕЛЬНІКАЎ,
дырэктар музея.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

Канферэнцыя чытачоў па кнізе лаўрэата Ленінскай прэміі С. Смірнова «Брэсцкая крэпасць» адбылася ў акруговым Доме афіцэраў.

Пісьменнік — генерал-маёр у адстаўцы М. Аляксееў, адкрываючы канферэнцыю, адзначыў, што творчая работа С. С. Смірнова з'яўляецца свайго роду помнікам гераічным абаронцам крэпасці над Бугам.

Аб гэтым гаварылі ў сваіх выступленнях капітан медыцынскай службы А. Габзоўская, старшы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны Л. Чванаў, палкоўнікі ў адстаўцы Ф. Качарга, С. Дзёмін, маёр І. Ярамчук.

Аб рабоце пісьменніка над кнігай расказаў прысутным удзельнік абароны Брэсцкай крэпасці А. Махнач.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

БЕЛЬГІЯ, ЯКАЯ ЯНА ЁСЦЬ

НЕКАЛІ Аляксандр Блок назваў Бельгію «маленькай краінай з вялікай гісторыяй». Ад самага пачатку сваёй гісторыі, калі ў краіну ўрываліся рымскія легіёны, і да нашэсця фашысцкіх ордаў, зведала яна нямала гора. Заціснутая з трох бакоў вялікімі краінамі, Бельгія з чацвёртага боку амываецца морам. І барацьба жыхароў краіны з морам была гэткая ж цяжкая, як з ворагамі. Мора размывала дамбы, і людзі аднаўлялі іх зноў і зноў. Таму не дзіўна, што менавіта ў гэтай краіне створаны такія паэтычныя казкі пра любоў да свабоды, як «Ціль Уленшпігель» і «Сіняя птушка».

Мы лепш ведаем мінулае бельгійскага мастацтва, горш — яго сённяшні дзень. Гэты прабел у нейкай меры запаўняе выстаўка твораў бельгійскіх графікаў, якая адкрылася ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. Тут экспануецца звыш сотні лістоў, створаных больш чым шасцюдзесяццю мастакамі.

Выстаўка дае досыць аб'ектыўнае ўяўленне аб сучасных пошуках бельгійскіх графікаў. У цэлым тут пераважаюць творы мастакоў-рэалістаў. Аднак у экспазіцыю ўключаны шэраг лістоў сюррэалістычнага, экспрэсіяністычнага і сімвалістычнага характару, даволі супярэчлівых па змесце і форме.

Можна смела сказаць, што большасць графікаў Бельгіі — неблагія назіральнікі жыцця. А вось вывады аб жыцці ў розных мастакоў прынцыпова розныя — у залежнасці ад іх месца ў грамадскай барацьбе. Таму мы знаходзім на гэтай выстаўцы і матывы трагічнага адчаю, песімізму, страху перад жыццём, услаўленне патрыярхальных звычак. І ўсё ж лепшае з выстаўленых твораў сцвярджае мужнасць, сілу, прыгажосць людзей працы.

Не маляўнічыя вулкі Бруселя і Антверпена, пляжы Астэндэ, начныя бары, нязграбныя вёсачкі і прыгажосць паркаў прываблываюць галоўную ўвагу лепшых бельгійскіх мастакоў. Дзякуючы ім, лепшым, мы бачым на выстаўцы Бельгію — краіну рыбакоў, сялян, жабракоў, краіну супярэчлівых грамадскіх адносін паміж людзьмі.

Мы сустракаемся на гэтай выстаўцы са старэйшымі майстрамі — такімі, як Курт Пейзер, Жак Окс, Жан-Жак Гіяр, Жуль Ван Памель, Жан Данэ, Іос Альбер і іншыя.

Савецкаму гледачу асабліва блізкі Курт Пейзер, афіцыйна, між іншым, не прызнаны. У яго лістах выразныя элементы сацыяльнай крытыкі існуючага парадку ў капіталістычным свеце, адлюстраванне жабрацтва і адчаю абяздоленых. Пра гэта сведчаць афорты «Дзеці рыбака» і «Начлежка» — жывыя дакументы сённяшняй бельгійскай рэчаіснасці.

Жан Данэ любіць у сваіх маляўнічых афортах паказваць пейзажы з сялянамі. Гэтыя лісты поўныя паветра і сонца («Касцы», «Поле»).

Цікавыя гратэскныя кампазіцыі Жака Окса «Карнавальная сцэна» і «У ложы». Ён своеасабліва парадзіруе звычкі і норавы буржуазнага грамадства.

Прыцягваюць увагу малюнкі вугалем Франса Дэпаотэра, архітэктурныя матывы Ляона Дэвоса, лісты Тафа Вале «Рыбачка» і «Жанчына з дзіцем». Гэтыя мастакі кожны па-свойму шукаюць прастаты і натуральнасці выяўлення пры лаканічнасці выяўленчых сродкаў.

У інакшым плане створаны вялікія апавядальныя афорты Вана Памеля «ААН» і «Спакушэнне святога Антонія». У іх своеасаблівае перапляценне натуралізму і сюррэалізму. Імкнучыся адлюстраваць усё, што толькі магчыма, аўтар звязвае разам у сваіх лістах караблі, вывяржэнне вулкана, мора, даўнейшую і сучасную архітэктуру, вадаспады, горы, фантастычныя істоты. За ўсім гэтым цяжка пранікнуць у тое, што хацеў сказаць мастак.

Шырока паказаны на выстаўцы пейзаж — ад вельмі традыцыйных рэалістычных пейзажаў Іоса Альбера, Марыса Леклерка, Жоржа Фрэдэрыка, Ладэ Маса да постэкспрэсіяністкіх малюнкаў Жака Маса, Рыка Слабінка.

Сярод партрэтаў у першую чаргу хочацца адзначыць лісты «Дзіця» і «Дзяўчынка» Сержа Крэза, «Партрэт П. Спаака» і «Партрэт Гюісманса» работы Альбера Крамелінка. Цікавая «Джульета на балконе» Леаніда Фрэшкопа. Сярод лепшых на выстаўцы і партрэт маці з сынам мастака Іосы Петэрса.

Мастачка Дэзірэ Эн у нацюрморце «Вясна» адмыслова спалучае паэтычнасць пяшчотнай кветкі і грубаватую суровасць выяўленчых прыёмаў.

Усё падпарадкавана дынаміцы адлюстравання ў работах Поля Дакселе «Баскетбол» і «Баксёры». Мастак цудоўна валодае тэхнікай вугалю.

Нельга тут не сказаць пра лісты сімвалістаў, постэкспрэсіяністаў і сюррэалістаў. Іх можна аднесці да так званых «фігуратыўных», «прадметных» адлюстраванняў, бо аўтары лістоў карыстаюцца вобразамі, якія нагадваюць пэўныя прадметныя формы. Пераважна такія адлюстраванні — са змрочным, песімістычным сюжэтам. У іх у асноўным эмоцыі аднаго плана— падаўленне свядомасці, нагнятанне жахаў. Зразумела, што мы не можам прыймаць такое мастацтва. І добра, што падобных лістоў на выстаўцы не шмат.

Большасць жа твораў бельгійскай графікі грунтуецца на рэалістычных пазіцыях і вызначаецца ўраўнаважанасцю, гармоніяй паміж задумай і сродкамі яе ўвасаблення, актыўнасцю ўспрымання свету.

Выстаўка сведчыць пра складаны і шмат у чым супярэчлівы шлях развіцця бельгійскай графікі ў нашы дні.

Барыс КРЭПАК.

Імя Паўла Левановіча

20 жніўня гэтага года газета «Літаратура і мастацтва» змясціла артыкул пра маладога беларускага пісьменніка Паўла Левановіча, які загінуў у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У артыкуле ўзнімалася пытанне аб ушанаванні памяці пісьменніка.

І вось з радзімы П. Левановіча, з горада Мсціслаўля, прыйшло паведамленне. 15 верасня на пасяджэнні выканкома Мсціслаўскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных прынята пастанова: для ўвекавечання памяці пісьменніка-земляка адной з вуліц горада прысвоена імя Паўла Левановіча.

Брэсцкі ансамбль танца «Радасць» арганізаваны ў 1962 годзе. Кіруе ім М. Пузанаў. Самадзейныя артысты выступалі ў Маскве, Мінску. Іх бачылі гледачы Закарпацця, Жытоміра, Роўна, Львова, Луцка і іншых гарадоў Украіны. Чатыры разы яны выязджалі ў Польскую Народную Рэспубліку.

Да 50-годдзя Савецкай улады самадзейныя артысты рыхтуюць харэаграфічную кампазіцыю «Чапаёўцы» і «Палескую рапсодыю».

На здымку — брэсцкая маладзёжная сюіта «Радасць» у выкананні ансамбля.

Фота Ул. КРУКА.

БЕЛАРУСКІ ЭТНАГРАФІЧНЫ АТЛАС

Стварэнне першага этнаграфічнага атласа Беларусі пачалі вучоныя Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Міністэрства культуры БССР.

Інстытут пачаў падбор матэрыялаў. Першая экспедыцыя правяла этнаграфічнае абследаванне Жлобінскага, Рэчыцкага, Хойніцкага, Добрушскага, Веткаўскага і некаторых іншых раёнаў Гомельскай вобласці.

Вучоныя мяркуюць выявіць неабходныя матэрыялы і ў архівах Беларусі, Масквы, Ленінграда, Вільнюса. Аднак асноўныя даныя даследчыкі збяруць у экспедыцыях, якія наведаюць усе раёны рэспублікі.

Этнаграфічны атлас Беларусі будзе часткай вялікага рэгіянальнага этнаграфічнага атласа, які ахапляе тэрыторыю Украіны, Беларусі, Малдавіі.

БЕЛТА.

ПЫТАННІ—РОЗНЫЯ, КЛОПАТ—АДЗІН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Прызнаюся, мне было сорамна за іх настаўніцу.

Або другі прыклад. Вучням настаўніца задала напісаць сачыненне на вольную тэму. Адзін школьнік напісаў пра абуджэнне лесу. Настаўніцы яго сачыненне здалося... беззмястоўным. Думаю, што такіх людзей нельга дапускаць да выкладання літаратуры і да выхавання дзяцей наогул.

Ну, а якую дапамогу аказваюць нам у гэтай справе пісьменнікі? Не вельмі вялікую. Можна назваць аднаго В. Вольскага, які амаль усю сваю творчасць прысвяціў роднаму краю. Яго кнігі маюць вялікае пазнавальнае значэнне. Але і яны чыталіся б куды больш ахвотна, калі б былі напісаны больш празрыстай, яркай мовай, больш хвалююча. Добрую справу зрабіла выдавецтва «Народная асвета», выдаўшы зборнік «Слова аб роднай прыродзе», у якім сабраны творы многіх беларускіх празаікаў і паэтаў, а таксама рэпрадукцыі з карцін беларускіх мастакоў-пейзажыстаў. Хочацца толькі, каб гэтая кніжка была той першай ластаўкай, за якой будуць цэлыя чароды падобных кніжак. Што яшчэ хочацца ўспомніць? Бадай, варта адзначыць кнігу І. Грамовіча «Сонца скрозь воблакі» — кніжку надзвычай паэтычную, поўную любві і замілаванасці да прыроды нашага краю. Але гэта, бадай, і ўсё. А спіс такіх кніг хацелася б бачыць значна даўжэйшым.

— Я толькі дадам некалькі слоў да таго, што гаварыла тут Святлана, — сказала вучаніца 11-га класа **Люда Пукач.** — Успамінаю сябе пяцікласніцай і шасцікласніцай. Ведаць, сапраўды, хацелася ўсё і ўсё адразу. Цяпер разумею, што гэта немагчыма, але ўсё ж — дзеці хочуць ведаць усё. І тут, мне здаецца, найбольшую карысць могуць і павінны прынесці навукова-папулярныя кнігі. А кніг такіх беларускія пісьменнікі пішуць вельмі мала. Я, напрыклад, ведаю толькі адну — «Скарбы балот» А.Чаркасава.

Слова васьмікласніцы **Іры Мірончык** прагучала коратка:

— Я люблю чытаць прыгодніцкія і фантастычныя кнігі. Але часта так бывае: прачытала —і забылася. Бо там толькі адно здарэнне ідзе за другім, а чаму, дзеля чаго — невядома. Людзі, героі гэтых кніжак, вельмі мала чамусьці думаюць, ніколі не сумняваюцца, не хвалююцца, таму, мусіць, і сам, калі чытаеш, таксама не думаеш і не хвалюешся.

Яшчэ карацей сказала яе аднакласніца **Нэла Жардзёва:**

— Пісьменнікі часта памыляюцца, калі ставяць на кніжках паметкі: для сярэдняга альбо старэйшага ўзросту. Возьмеш чытаць такую кніжку, нават з паметкай «для старэйшага ўзросту», а нецікава — быццам для першаклашак напісана.

— Нашы дзеці рана пачынаюць цікавіцца кнігай, — сказала заслужаная настаўніца школ БССР **Л. Язвінская.** — І інтарэсы іх самыя разнастайныя. Мае пяці- і шасцікласнікі цікавяцца літаральна ўсім. Маленькіх, натуральна, больш за ўсё вабіць казка — і народная, і літаратурная. А ў чытанках казак чамусьці мала, асабліва літаратурных. Напрыклад, чаму б не ўключыць у чытанкі казку Якуба Коласа «Рак-вусач»? Думаю, што і гэта пытанне з тых, якія датычацца развіцця беларускай дзіцячай літаратуры.

Правільна тут гаварылі наконт выдання кніг для дзяцей. Шматтомныя выданні хай будуць шматтомнымі, але трэба часцей і большымі тыражамі выдаваць лепшае з нашай спадчыны — асобнымі і таннымі выданнямі. Напрыклад, чаму б часцей не перавыдаваць «Міхасёвы прыгоды» Я. Коласа, апавяданні М. Лынькова? Кажу гэта хоць бы таму, што ў нашай бібліятэцы, у школе-інтэрнаце, гэтых кніг няма.

Школа — гэта жыццё дзяцей. Як ні дзіўна, менавіта пра гэта забываюць нашы дзіцячыя пісьменнікі. Яны пішуць пра канікулы школьнікаў, пра асобныя іх прыгоды на турысцкіх сцежках і г. д., але ж дзецям найбольш патрэбны кніжкі менавіта пра школу, не пра школьны будынак, а пра школу як пра з'яву. Карацей, кніжкі пра саміх сябе. Пра гэта ў нас можна ўспомніць, як пісаў завадатар дыскусіі Б. Зубкоўскі, толькі кніжку М. Чарняўскага. Кніжка гэтая сапраўды не дужа сур'ёзная, бо Бегунок аўтара толькі што пачынае думаць...

Наколькі я ў курсе справы, не ўсё добра ў нас з прыгодніцкай, фантастычнай кнігай, з кнігамі аб прыродзе роднага краю. Слушна гаварыла тут Люда аб навукова-папулярнай літаратуры — яна вельмі патрэбна дзецям. Тут, вядома, ёсць свае цяжкасці. Не кожны вучоны — літаратар, як Ціміразеў ці Ферсман, і не кожны літаратар — вучоны. Але ж выйсце ёсць. Пісьменнікам і вучоным трэба супрацоўнічаць. Як мне помніцца, гэта ў традыцыях савецкай літаратуры.

Кажуць, дзеці мала чытаюць вершаў. Часам вінаваты ў гэтым мы самі, настаўнікі, аб чым красамоўна гаварыў тав. Чарэнда. Мы не прывучаем дзяцей да ўспрымання паэзіі, мала аддаём увагі выразнаму чытанню, часам і самі не ўмеем прыгожа прачытаць верш. Але, мне здаецца, часта і паэты адрасуюць малым чытачам сыраватыя, недапрацаваныя творы. Не магу тут — няма пад рукамі кніг — назваць каго-небудзь канкрэтна, але добра знаю, што на старонках «Пісьменніка Беларусі», «Бярозкі» і «Вясёлкі» такія вершы надараюцца часта.

Нелады ў нас і з драматургіяй для дзяцей. Нашы выхаванцы вельмі любяць самадзейную сцэну. А вось з чым выйсці на гэтую сцэну — праблема. А. Махнач і В. Зуб вакууму не запоўняць.

Ну і, вядома, мы, настаўнікі, павінны рабіць значна больш па прапагандзе роднай літаратуры. Ці часта, напрыклад, наладжваем мы ў школах кніжныя выстаўкі? Не, не часта, а то і зусім не наладжваем. А каталогі — ілюстрацыйныя для маленькіх, тэматычныя для старэйшых? Іх таксама не ўбачыш у школе, у класах...

— Дзіўная рэч: вершаў у нас шмат, а чытаюць іх дзеці мала, — пачаў адзінаццацікласнік **Васіль Шырко.** — Мода такая пайшла ці што. Самі бібліятэкары часам здзіўляюцца, калі ў іх папросіш вершаваную кнігу. Нядаўна я папрасіў у гарпасялковай бібліятэцы кнігу П. Панчанкі, дык бібліятэкарка здзівілася: вось дзівак, кажа, выдумаў жа — вершы чытаць! Ну, але гэта к слову. А чаму дзеці не чытаюць вершаў? Пра гэта ўжо гаварылі тут, называлі розныя прычыны. Я скажу адно: не заўсёды цікава пішуць нашы паэты для дзяцей. Я сам спрабую пісаць, дык вершаў шмат чытаю. І бачу часта не вершы, а зарыфмаваныя павучанні, частушкі «на злобу дня». Мова ў такіх творах газетная, рыфмы — прыблізныя (кажуць, што сучасныя). Чытаць такое сумна. А ўвогуле трэба пісаць, мусіць, як Янка Маўр — і праўдзіва, і займальна, і павучальна, і запамінальна. І прозу, і вершы.

Апошнім гаварыў на гэтай сустрэчы настаўнік-пенсіянер **І. Шаблюк:**

— Не магу не успомніць свайго маленства. Якое было шчасце, калі трапляла ў рукі кніжка! А цяпер у нас для дзяцей выпускаюцца горы кніг, газет і часопісаў. А мы вось кажам: мала. І яно праўда. У манбланах друкаванай прадукцыі ёсць істотныя прабелы.

Возьмем такую праблему — працоўнае выхаванне падрастаючага пакалення. Робім мы для гэтага далёка не ўсё. Бо вось жа бачым: канчае юнак школу, не паступіў у інстытут і лынды б'е, а пайсці на працу ў калгас — сорамна. А без працы ж — няма чалавека. Гэтаму не навучылі юнака ні мы, настаўнікі, ні кнігі. Часам, праўда, аб гэтым гаворыцца ў кнігах. Але, звычайна, вельмі ўжо ў лоб. Трэба так сказаць, каб дзіця само зразумела, што ўсялякая праца — ганаровая і патрэбная. Не любяць дзеці, калі яго, як сляпое кацяня, тыкаюць: будзь такім, а не гэтакім.

Хай мы тут не гаварылі аб тэарэтычных пытаннях развіцця нашай дзіцячай літаратуры (гэта, зрэшты, хлеб прафесіянальных крытыкаў), але і тое, што было сказана, здаецца мне надзённым і важным. Асабліва для нас, настаўнікаў і бібліятэкараў. Нам, напрыклад, трэба памятаць, што паміж чытачом і кнігай павінен заўсёды быць пасрэднік, старэйшы таварыш. Пасрэднік патрэбен малому чытачу, і патрэбен заўсёды, штодзень. Нам трэба быць заўсёднымі і настойлівымі прапагандыстамі роднай літаратуры. А ў нас, бачыце, у школе няма нават партрэтаў пісьменнікаў, на ўроках мы не можам паказаць дзецям альбомаў, плакатаў. І тут таксама адказ на тое, чаму дзеці, напрыклад, вершаў не чытаюць і не любяць. Чаго не ведаеш, не палюбіш...

Пытанні, якія мы тут узнімалі, розныя, а клопат наш і клопат пісьменнікаў павінен быць адзін: каб наша літаратура для дзяцей была вартай сённяшніх дасягненняў нашай «дарослай» літаратуры, каб яна была надзейным і цікавым дарадцам і сябрам чалавека на пачатку яго жыцця.

Літаратура і мастацтва 2
Аўторак, 5 кастрычніка 1965 г.

ЧАСОПІСЫ ў кастрычніку

ПОЛЫМЯ БЕЛАРУСЬ МАЛАДОСЦЬ

„ПОЛЫМЯ», «БЕЛАРУСЬ», «МАЛАДОСЦЬ». Дзесятым кастрычніцкім нумары... Хутка яны лягуць на сталы падпісчыкаў і на прылаўкі кіёскаў. Чым жа яны парадуюць чытачоў?

«ПОЛЫМЯ».

Кастрычніцкі нумар часопіса адкрываецца вялікай нізкай «Новых вершаў» Максіма Танка. Падборку змяшчае тут і Антон Бялевіч. Проза прадстаўлена працягам рамана Івана Мележа «Подых навальніцы» і ўрыўкам з аповесці «Людзі растуць» італьянскага пісьменніка Альда Северыні ў перакладзе на беларускую мову А. Шаўні. Рыгор Кобец друкуе аднаактовую п'есу «Святая тайна».

Да Дзён культуры Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі ў Беларусі «Полымя» змяшчае вершы і апавяданні нямецкіх пісьменнікаў: Стэфана Хэрмліна, Макса Цымерынга, Фрыдрыха Вольфа, Анны Зэгерс і Петэра Віпа.

У раздзеле «Нарысы» друкуецца працяг нарыса Ігната Дубровускага «Зямныя вузлы». Публіцыстыка прадстаўлена артыкуламі Алеся Махнача (аб драматургіі малых форм), Міколы Прашковіча (пра Францішка Скарыну) і Адама Мальдзіса (пра кампазітара Станіслава Манюшку).

З артыкуламі «Жывая гісторыя» (па старонках раманаў А. Чарнышэвіча) і «Слоўнік мовы В. Дуніна-Марцінкевіча» ў раздзеле «Крытыка і літаратуразнаўства» выступаюць Я. Герцовіч і С. Грабчыкаў. Надрукаваны ў нумары тансама рэцэнзіі Я. Усікава на кнігу Ф. Куляшова «Эцюды аб прозе», А. Вярцінскага на зборнік апавяданняў І. Чыгрынава «Птушкі ляцяць на волю», Г. Юрчанні на кніжку А. Якімовіча «Прыгоды хлопчыка Іларыка» і рэцэнзія З. Капыскага на выдадзеную ў Маскве кнігу Н. Улашчыка «Прадумовы сялянскай рэформы 1861 года ў Літве і Заходняй Беларусі».

Часопіс працягвае публікацыю «Матэрыялаў да слоўніка сінонімаў і блізказначных слоў», сабраных М. Клышко.

«БЕЛАРУСЬ».

Літаратурныя матэрыялы ў часопісе прадстаўлены вершамі Міколы Хведаровіча, Рамана Тармолы, Антона Бялевіча, Рыгора Барадуліна, апавяданнямі Міколы Ваданосава, Ігара Хадановіча, урыўкам з новага рамана Піліпа Пестрака, замалёўкамі Аркадзя Кандрусевіча і Рыгора Ігнаценкі. Да Дзён культуры ГДР у нашай рэспубліцы часопіс друкуе апавяданне «Марта» Анны Зэгерс і вершы Бертольда Брэхта і Кубы.

Як заўсёды, у часопісе шмат нарысаў, замалёвак і рэпартажаў. М. Сталяроў, напрыклад, расказвае пра будаўнікоў Полацкага політэхнічнага завода, І. Кармалітава — аб працаўніках калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Стаўбцоўскага раёна, І. Скапараў — аб будаўніцтве дарог у рэспубліцы, А. Слесарэнка — пра сустрэчы з Якубам Коласам. Змешчаны таксама артыкулы А. Міцкевіча аб выхаванні моладзі, Г. Галенчанні — аб старажытных беларускіх кнігах у англійскіх бібліятэках, Д. Фактаровіча — аб беларускіх перакладчыках.

У гэтым нумары надрукаваны рэцэнзіі Т. Абакумоўскай на зборнік вершаў А. Пысіна «Мае мерыдыяны», А. Ляпіча на раман М. Гарэцкага «Віленскія камунары», М. Калачынскага на кнігу ўкраінскага даследчыка Б. Чайноўскага «Незабыўная старонка дружбы» і М. Бондара на кнігу У. Сасінскага, В. Андрэева і Л. Прокшы «Герої Алерона».

«МАЛАДОСЦЬ».

Часопіс, як звычайна, аддае свае старонкі маладым аўтарам. Так, у кастрычніцкім нумары надрукаваны нізкі вершаў Генадзя Бураўкіна, Васіля Гусціновіча, аповесць Уладзіміра Дамашэвіча «Студэнты апошняга курса» і апавяданне Ірыны Крэнь «Антон Чобат». Пад рубрыкай «Да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка» змешчаны артыкулы «Легендарны Гая Гай» С. Шушкевіча і «Першы народны мітынг» Ул. Цітка.

Раздзел «У свеце прыгожага» прадстаўлены артыкуламі В. Сахненкі (пра сёлетніх выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута) і А. Бляхера (пра мастачку, удзельніцу Вялікай Айчыннай вайны С. Уранаву).

У раздзеле «Гэтых дзён не змоўкне слава» надрукавана дакументальная аповесць журналістыкі А. Захарэнкі «Сказ пра бясстрашных» — аб юных удзельніках Хойніцкага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У нумары змешчана рэцэнзія С. Андраюка на аповесць А. Карпюка «Пушчанская адысея».

Ёсць у часопісе таксама раздзелы «Фотаклуб «Маладосць», «Старты і фінішы», «Шахматы», «Шашкі», «Цікава ведаць».

На гэтай старонцы газеты друкуем некаторыя матэрыялы з кастрычніцкіх нумароў нашых літаратурна-мастацкіх і грамадска-палітычных часопісаў.

Раман ТАРМОЛА
(«Беларусь»).

НЕСПАКОЙ

Можна проста спакойным быць.
Можна мець спакой алімпійскі.
Лепш не знаць спакой абеліска,
Лепш тады з неспакоем жыць.
Неспакой за сваё дзіця.
Неспакой за спакой жыцця.
Неспакой, як найпершы бой
З заспакоенасцю любой.

Будзьце вочы вачм! відушчымі,
Будзь пагляд мой стралою пушчанай
Не ў вялікае сэрца сонцава—
У спакойненькага і соннага.
Не магу, не хачу інакш.
Чалавечак, анёл мой пошлы,
На цябе я заўжды патрачу,
Як патрон, мой радок апошні.

Бертольд БРЭХТ
(«Беларусь»).

НЕПЕРАМОЖНЫ НАДПІС

У час вайны сусветнай
У камеры цямніцы італьянскае Сан-Карла,
Што поўная была жаўнераў, п'яніц і зладзеяў,
Салдат-сацыяліст карандашом хімічным на сцяне накрэсліў:
«Жыве Ленін!»
У змрочнай камеры ўгары, ледзь бачна, але
Жахлівымі надзвычай літарамі вывеў:
«Жыве Ленін!»
Вахцёры, гэта ўбачыўшы, пабельшчыка накіравалі з вапнай,
Каб ён крамольны надпіс доўгапалым пэндзалем замазаў.
Аднак, калі маляр па літарах прайшоўся вапнай,
Яны з-пад столі праступалі праз пабелку:
«Жыве Ленін!»
Тады другі маляр шырокім пэндзалем сцяну ўсю выбеліў,
І надпіс знік на некалькі гадзін, але ўжо ўранні,
Калі прасохла вапна, зноў палаў:
«Жыве Ленін!»
Быў выкліканы муляр, і нажом
З гадзіну літару за літарай ён скроб той надпіс,
А як закончыў, высока ў камеры заззяў ужо бясфарбны,
Але глыбока ў мур праскрэблены непераможны лозунг:
«Жыве Ленін!»

— Прыдзецца мур бурыць!—сказаў салдат.

З нямецкай мовы пераклаў
П. БІТЭЛЬ.

Антон БЯЛЕВІЧ
(«Полымя»)

БАЛАДА

А было ж — і дні, і ночы ўсе
Я кудзелю прала,
Кужаль ткала.
Я палотны слала па расе,
Па траве вясковай высцілала.

Іх бялілі ліўні, белы град,
Сонца іх бяліла ды сушыла...
Любы мой, з вайны прыйдзі назад —
З кужалю кашулю я скраіла.

Паляжы, кашуля, пачакай.
Можа прыйдзе скора наша свята?..
Май шуміць. Даўно зялёны май
Пазбіраў акопнікаў дахаты.

А майго няма ўсё. Не ідзе.
Можа паваліла ў полі куля?
Валасы бялеюць у бядзе,
Нібы тая белая кашуля.

На яе я капнула слязой —
Белую слязіна прапякае...
Хто за рэчкай, сумнаю лазой
Ранкам мяне з хаты выклікае?

Выбягаю...
Чую: воран — кар-р-р...
Чорны воран за ракою сіняй
Каркае: — Не прыйдзе гаспадар
Дому твайго, бацька твайго сына...

Пачарнеў, як воран, родны кут;
Рэчка чорным вірам закіпела;
Пачарнела я з нуды, пакут;
Белая кашуля пачарнела.

Ой, навошта ж слухаць мне было
У самоце ворана старога?!
Хтось ідзе дарогай у сяло.
Гэта ж ён... Чаканы ля парога!..

Мікола ХВЕДАРОВІЧ
(«Беларусь»).

■ ■ ■

Не будзьце такімі сквапнымі.
Не трэба, не трэба старацца
Прамудрымі стаць эскулапамі,—
Не трэба ні позы, ні глянцу.
Шануйце усё сапраўднае,
Не верце хвальбе і тандэту.
Хай будзе ў падліках дакладнае,
Імклівае, як ракеты.
Вітайце высновы адвечныя, —
Наступу, не абароны.
А словы хай будуць сардэчныя
І не ліняюць да скону.
Не будзьце занадта салодкімі,
І мёд ачмурае да млосці.
Найлепей размовы кароткія
Без гонару ліпкага, злосці.
Праславім жа дружбу трывалую
І песняй, і сэрцам салдата.
Адкінем трывогі нясталыя
І станем душою багаты.
Няхай жа хутчэй забываюцца
Людская нядоля, напасці.
Прыемна, што людзі кахаюцца, —
То іх найвялікшае шчасце.
То мара людская адвечная,
Дзе радасць, трывогі, сумненні.
І гэта — дарога бясспрэчная
Усіх на зямлі пакаленняў.

Малюнак І. ДАВІДОВІЧА да аповесці Ул. Дамашэвіча «Студэнты апошняга курса».

Максім ТАНК
(«Полымя»)

НОВЫЯ ВЕРШЫ

ЁН ЗАРАБІЎ НА ХЛЕБ

Калісьці, памагаючы старэйшым,
Малому, так хацелася пачуць
Ад бацькі ці ад маці,
Што, як і ўсе,
Я зарабіў на хлеб.

Тады так радасна было,
Прысеўшы за сталом,
І лусту ўзяць у рукі,
І бульбіну ў соль памачыць,
І лыжкай зачарпнуць бацеіння.

І смачнае было ўсё —
Словы і маўчанне.

Шмат сёння пройдзена
Дарог жыццёвых.
Ёсць недзе дрэва, што я пасадзіў,
Ёсць недзе вогнішча, што я зацепліў,
Ёсць недзе песня, што сябрам пакінуў.

Але за ўсё, што зроблена
І што зрабіць мне ўдасца,
Я большай пахвалы не знаю,
Як гэта, чутая ў дзяцінстве:
— Ён зарабіў на хлеб...

І можа варта было б ордэн
Устанавіць такі,
Якім узнагароджвалі б тых,
Хто сапраўды
На хлеб свой зарабіў.

АНКЕТЫ

Устарэлі даўно ўсе анкеты.
Што з таго, калі нехта напіша
Імя, прозвішча, дзень нараджэння,
Яную пасаду займае,
Дакладны свой адрас
І нумар свайго тэлефона...

Калі без анкеты ўжо нельга
Ніяк абысціся,
Дык хоць замянілі б
Старыя пытанні другімі.
Напрыклад:
Аб чым найбольш любіце марыць?
Якія вас творы хвалююць?
Ці верыце ў дружбу, каханне?
Ці крыўдзе заўсёды давалі адпор?
За што вы гатовы змагацца
І нават памерці?..

Мо на некаторыя з гэтых пытанняў
Нялёгка за дваццаць мінут
Адказаць.
Не трэба спяшацца,
Лепш у адлаводнай графе напісаць:
Над гэтым пытаннем
Я яшчэ думаю.

ІНСТРУКЦЫЯ

Даўно «завяшчанне» як слова ўстарэла.
Яно пахне нат метафізікай прэлай.
Таму я «інструкцыяй» яго замяняю —
Словам бадзёрым і больш папулярным.
І так, дарагія сябры, абвяшчаю
Вам волю сваю.
У той дзень каляндарны,
Калі не змагу хлеб ад камня адрозніць,
Няпраўды — ад праўды, слана — ад барана,
Біклагі з віном—ад біклагі парожняй,
Паэта сапраўднага — ад графамана,—
Мяне без прамоў, без труны пахавайце,
А дошні майстрам на цымбалы аддайце.
Нарогам, ці можа рыдлёўкай іржавай,
Курган мой зраўняйце з зямлёю спрадвечнай,
Каб, часам, не ўздумаў хто помнік паставіць
Або агароджай яе пакалечыць.
І вершы спаліце, каб нейні зануда
Пра іх дысертацыі не нагрымзоліў.
Калі яны нечага варты—жыць будуць
І так на маім нарачанскім падзоле.
Вось толькі на шлях мой апошні, пражыты,
Сыпнуць не забудзьце хоць прыгаршчы жыта!

Малюнак Ю. Пучынскага да апавядання М. Ваданосава «Ці вінаваты!».

Васіль ГУСЦІНОВІЧ.
(«Маладосць»).

БУКВАР

Я кніжкі бярог, як калісьці сухар,
Як сад, так цяшчотна і дбайна...
Трымаю ў руках даваенны буквар —
Звычайная кніжка, а лёс незвычайны...
У дождж мы стаялі на школьным двары
І слухалі немца, узняўшы галовы.
«Заўтра прынесці ўсім буквары.
Партрэты закрасліць і выкрасліць словы:
«Савецкі Саюз», «піянер»,
«камуніст» —
Нам родныя словы, як бацька і маці.
Ніхто з нас не вырваў хаця б адзін ліст...
Я кніжку схаваў пад падлогаю ў хаце.
Шукалі нас кулі на сотнях дарог,
Не ручкі, гранаты мы клалі на парты.
Быў крэпасцю нашай бацькоўскі парог,
Мы — дзеці герояў, якіх будзем варты!
Ад кніжкі намнога святлейшы пакой,
Напомніць яна аб суровым паходзе.
Таму я з душаўнаю ласкай такой
Буквар даваенны хаваю ў камодзе.

Фрыдрых ВОЛЬФ

Вішнёвыя завушніцы

Ліпень 1941 года. Дашчэнту спаленая немцамі маленькая беларуская вёска. Сярод чорных папялішчаў хаваецца, зелянее невялічкі садок, у якім адзіная на ўсю вёску хатка. Тут жа, узбоч гэтага зялёнага аазісу, працякае рачулка. Хто ведае, можа якраз яна і сад выратавалі хату Міхала Васільевіча—дзеда Міхея.

У садзе, разам з афіцэрамі свайго штаба, сядзіць нямецкі капітан, камандзір пяхотнага батальёна. Штаб балюе на свежым паветры. Абед канчаецца. Захмялелы капітан кліча ардынарца і, кіўком галавы паказаўшы на высокую старую вішню, загадвае нарваць вішань. Ардынарац шукае драбіну, але не знаходзіць. Гаспадар, дзед Міхей, апраўдваецца: кажа, што нямецкія салдаты спалілі яе, як варылі абед.

— Прынясі сякеру, рус,—загадвае капітан.

Стары прыносіць сякеру. Услед за ім ідзе яго жонка.

— Паварочвайся хутчэй, мужык! Сячы вішню!—крычыць капітан.—Мы хочам вішань. Нам няма часу лазіць па дрэвах!

Ардынарац рукамі і выкрыкамі стараецца расглумачыць дзеду Міхею, што загадвае капітан. Але стары нават не кранаецца з месца. Ён моўчкі глядзіць на вішню, на зялёнае лісце, праз якое чырванеюць спелыя ягады. Капітан нервуецца. Ён падыходзіць да старога, сціскае яго руку з сякерай сваімі ўчэпістымі пальцамі і наносіць першы ўдар па ствале.

Дрэва ціха задрыжала. На зямлю падаюць дзве вішні, якія зрасліся, быццам завушніцы.

— Калі пачаў—трэба канчаць.

Але стары стаіць з сякерай у руцэ і глядзіць на глыбокую рану, якую нанеслі дрэву.

— Давай!—крычыць капітан.— Чаго глядзіш?

Хмель стукнуў капітану ў галаву.

— Пракляты рус! — крычыць капітан на старога.—Варушыся хутчэй, руская свіння, а то...—Ён хапаецца за рэвальвер.

Старая кідаецца да свайго чалавека, штосьці паспешліва яму гаворыць. Глыбока ўздыхнуўшы, стары бярэ сякеру і пачынае секчы вішню. Пад кожным новым ударам дрэва цяжка стогне. Навокал дажджом сыплюцца ягады. Так многа вішань афіцэрам не з'есці. Дрэва стогне, як жывое. Сякера старога Міхея ўсё глыбей уядаецца ў драўніну.

Ардынарцы дзесьці знайшлі пілу. Яны хочуць падрэзаць дрэва.

Капітан абыякава сядзіць за сталом і нібыта нічога не бачыць, акрамя шклянкі віна, што стаіць перад ім.

Раптам ён крычыць ардынарцу:

— Ідзіце прэч! Гэта праца не для вас! Дайце пілу рускам!

Міхей зноў завагаўся. Ён павярнуўся і глядзіць капітану ў вочы. Але старая бярэ пілу і другі канец падае старому. Раз-два... Раз-два... Яны водзяць і водзяць пілой па ствале.

П'яным афіцэрам сумна. Яны бяруцца за карты. Прыжмуранымі, пачырванелымі ад віна вачыма капітан глядзіць на заліты сонцам сад, на вялізныя сукі дрэва, на якіх калышуцца тысячы рубінавых завушніц.

Старыя зрабілі неслыхную перадышку. Міхей выцірае рукавом з твару пот. Ён таксама глядзіць на крону свае вішні. Міхей сам пасадзіў яе шмат гадоў таму назад, рупліва даглядаў. Нямала летніх вечароў сядзелі яны з жонкай пад гэтым дрэвам.

Стары глядзіць на жонку. У яе таксама выступіў пот на ілбе. Яна сумна ўсміхаецца, кіўком галавы падбадзёрвае мужа. І яны зноў пілуюць.

Нарэшце дрэва пахіснулася. Капітан ускоквае з крэсла і адыходзіць убок. Афіцэры, кінуўшы карты, таксама адышліся. Ардынарцы накінулі на дрэва вяроўку. Яно пачало паволі хіліцца. Магутны ствол паварочваецца на пні, рвуцца апошнія валокны, і вішня, са стогнам абломваючы голле, валіцца на зямлю.

Цяпер, здаецца, усё. Старыя хочуць пайсці. Ды не, яшчэ не ўсё. Старой загадана абарваць вішні і акуратна, у кошычку, падаць іх на стол афіцэрам. Потым яна павінна наабіраць кошык вішань і ардынарцам. І яшчэ адзін кошык паставому, што на вуліцы.

Капітан павесялеў. Ён цават жартуе: бярэ дзве вішні-завушніцы і вешае іх старому на левае вуха. Другой «завушніцай» ён упрыгожвае старую.

— Гэта — вашы.—Ён падымае шклянку віна і залпам яго выпівае.—Цяпер можаце ісці. Заўтра ўранку я знайду вам новую работу.

Але раніцой капітан не змог даць абяцаную работу. Па-першае, таму, што ён і яго ад'ютант з праламанымі чарапамі ляжалі на пасцелі ў хаце. Па-другое, таму, што гаспадары хаты зніклі. Не было таксама і сякеры. Усё, што пакінулі нз памяць аб сабе старыя,—гэта дзве вішні-завушніцы. Яны віселі, як застылыя кроплі крыві: адна—на левым вуху капітана, другая—на вуху яго ад'ютанта.

Анна ЗЭГЕРС

Навасёл

Брудны і абарваны, дабіўшы свой абутак і скрывавіўшы ногі, прыплёўся ў канцы вайны Антон Бандуш са сваёй да смерці стомленай жонкай у вёску Хагевальд. Хлусня, адчай і страх доўга раз'ядалі яго душу; у ёй і пякло, быццам яна была ў струпах. На кожнае слова ён толькі злосна агрызаўся. Руку, якую падавалі яму, са злосцю адпіхаў, быццам чакаў ад яе ўдару, ад усякай дапамогі адмаўляўся. Не верыў ён больш ні ў каго і ні ў што на свеце.

Доўга трэба было жонцы ўгаворваць яго, пакуль ён, нарэшце, пайшоў на поле, якое дала яму дзяржава. Атрымаў ён і самае неабходнае з інвентару, і карову далі яму з панскай фермы, і некаторую дробную жывёлу набыў бясплатна. Стаў Бандуш навасёлам, але працаваў спачатку неяк нехаця.

Ды ўсё ж, відаць, і яму ўпадабаліся новыя законы, калі крэдыт сталі даваць на будаўніцтва, і ён сваё жытло займеў. Тут ён, нарэшце, на людзей кідацца перастаў. Але зрабіўся яшчэ больш маўклівы. Слова, бывала, з яго не выцягнеш, нібыта ён гаварыць развучыўся. Маўкліва, упарта працаваў ён на сваёй ніве, на людзі ніколі не паказваўся—ні на сходы, ні нават у піўную не хадзіў. Што ў яго на душы—нават жонцы сваёй не выдаваў, быццам і не было ў яго ніякіх думак, быццам усё нутро высахла.

А гэтым летам, калі ў Хагевальдзе свята ўраджаю спраўлялі, гэты Антон Бандуш раптам знайшоў, як яму выказаць, што ў яго на душы.

Святочнай чарадой цягнуліся ўпрыгожаныя, поўныя снапоў вазы, а Бандуш павольна крочыў сярод іх са змрочным і злосным тварам, апрануты ў старызну. За сабой ён цягнуў скрыпучыя калёсы, нагружаныя ўсякім непатрэбствам—анучамі, падраным абуткам... На калёсах была прымацавана дошка з надпісам: «Вось што мне далі Гітлер і вайна».

А ззаду, высока на снапах, прыбраная ў самае лепшае, смеючыся, ехала яго жонка. На яе возе была таксама дошка з надпісам: «Вось што мне далі Савецкі Саюз і Германская Дэмакратычная Рэспубліка».

Петэр ВІП

Два гатункі дэмакратыі

— Дык я Ехену і кажу: «Глядзі, кажу, пляменнік, трымай вуха востра. Мы ўжо на Пацдамэрпляц, так што ты паглядвай! Трымайся правай рукі, а то ў амерыканскі сектар заедзеш, а яны цябе адразу зграбуць, і тады ўсё прапала, і лісты з подпісамі—таксама! Гэтыя «амі»—яны проста са скуры лезуць, каб свайго дабіцца, сам ведаеш, нічым не грэбнуць...»

Вось, значыць, усё гэта я яму кажу— і як вы думаеце, каго я раптам бачу? Гайні! Жывы Гайні! Стаіць сабе на рагу! З гэтым Гайні мы яшчэ ў маі сорак пятага разам вошай кармілі —за калючым дротам, вядома. Быў ён тады худы, глядзець страшна—ну, проста парожняя бляшанка ад амерыканскай тушонкі... Ну, а цяпер не пазнаць хлопца—куды там! Гарнітур, шчыблеты—шык ды бляск!

— Гайні, ці ты гэта?— пытаюся.

— А, гэта ты, Эдуард!—кажа ён.

Нейкі момант мы разглядвалі адзін аднаго... Бачыць ён мазалі ў мяне на руках.

— Прабач,—кажа,—на жаль, я спяшаюся.

— Так,—кажу я,—падобна да гэтага. На спатканне, відаць?—і гляджу проста яму ў вочы.

Гайні крыху чырванее, відаць, збіраецца таксама нешта сказаць, і раптам—гоп, і стаіць хлопец ужо за слупам, на якім напісана, што тут сектаральная граніца.

— Што здарылася? — пытаю я, нічога не цямячы.

А Гайні сунуў у рот цыгарку—відаць, не з танных—дый кажа:

— Мне да вас няможна, у мяне поўныя кішэні валюты, а гэтая свіння на рагу мяне ўжо ведае.

— Ага,—кажу я,—вось, значыць, ты з якіх будзеш!

— Што значыць—«з якіх будзеш»?—кажа ён, —Жыць жа кожнаму трэба. Ды ты пераходзь сюды, мы з табой паталкуем.

Тут мяне разбірае смех, і я кажу:

— Ах, дружа, я да цябе таксама не магу перайсці! Бачыш—вунь Ехен стаіць, мой пляменнік, у яго лісты на подпісы за адзінства Германіі, а ў вашым сектары гэта штука небяспечная! Шкада, шкада, а то якраз на бланку і месца ёсць, я думаў, можа б і ты...

— Я?—пытае Гайні з жахам.—Я? Гэта каб я сваімі рукамі стаў сабе яму капаць? Не, брат, на мой інтэрас патрэбна такая дэмакратыя, дзе дзелавы чалавек можа камерцыяй займацца!

— А хіба не ты ў лагеры гаварыў: нам трэба дэмакратыя, свабода, каб просты чалавек над усім гаспадаром быў...

Куды там!.. Мой Гайні толькі пазяхае. Вось гэтак мы і стаім: я ў сваёй дэмакратыі, ён — у сваёй, я з подпісамі за адзінства Германіі, ён са сваёй крадзенай валютай... Ззаду, за мной—паведамленне аб паляпшэнні забеспячэння рабочых раёна Берліна, а за спіной Гайні шпацыруюць два белыя шлёмы—амерыканская паліцыя... Вось так мы і стаім... і нават руку адзін аднаму падаць не можам, бо нас раздзяляе не толькі граніца паміж сектарамі!

Потым, па дарозе, Ехен тузануў мяне за рукаў і пытае.

— А што гэта там было, дзядзечка?

А я яму кажу:

— Два гатункі дэмакратыі, пляменнік.

Пераклаў з нямецкай
Мікалай НАВІЦКІ.
(«Полымя»).

Незвычайныя звычаі

ПЛАНЕТА СВЯТКУЕ ВЯСЕЛЛЕ

У СУДАНЕ прадстаўнік канторы, што рэгіструе шлюб, у прызначаны час сам прыходзіць да жаніха. Як бачыце, шлюб у гэтай краіне арганізован з усімі выгодамі, нават ісці нікуды не трэба. Вясельны кантракт абмяркоўваюць і падпісваюць старэйшыя мужчыны абедзвюх сем'яў. Тут заадно і дамаўляюцца, колькі грошай бацькі нявесты атрымаюць адразу, а таксама колькі ім належыць спляціць у выпадку разводу. Маладыя могуць не ўдзельнічаць у гэтых грашовых разліках, ім не абавязкова прысутнічаць і на ўласнай жаніцьбе. Затое потым яны сем дзён п'юць і гуляюць з сябрамі ў доме нявесты.

Закон дазваляе суданцам мець па чатыры жонкі. А ў некаторых суданскіх плямёнах, асабліва ў чулукаў,— і па дваццаць. Пры гэтым, калі памірае бацька, старэйшы сын павінен жаніцца з усімі ўдовамі, акрамя сваёй маці.

Кволыя кветкі памаранчавага дрэва лічацца ў італьянцаў сімвалам чысціні. Таму, калі раніцай вясельны картэж з пенямі прастае з марыў у кафэ, нявеста нясе ў руках букет кветак памаранчавага дрэва. За сталом яна частуе сяброў белымі вясельнымі цукеркамі, дорыць дзяўчатам свае кветкі. Існуе прыкмета: колькі галінак дасць сяброўцы маладая, столькі гадоў госця не пойдзе замуж.

Даўнішняя прымаўка кажа, што ў кожнай японкі ў высокай зачосцы схаваны небяспечныя рожкі. Таму нявеста абавязкова накрывае галаву хусткай, якая называецца «схавай рогі рэўнасці». Калі дзяўчына пакідае родны дом, яе бацькі наладжваюць пачэсную цырымонію: яны падмятаюць і мыюць падлогу, паляць каля варот агонь. А ў доме жаніха падаецца лёгкая закуска і трохі віна. Нярэдка бедныя японцы наладжваюць вясельны стол у складчыну.

Пышнае свята жаніцьбы бірманскіх юнака і дзяўчыны пакідае незабыўнае ўражанне. Яно цалкам пабудавана на старадаўніх народных звычаях. Адзначым, што чыста рэлігійныя абрады тут адсутнічаюць. Усё пачынаецца з запрашэння ў дом да жаніха вельмі паважанай фігуры — «пона», астролага, які вызначае «найшчаслівейшы час» (дзень і гадзіну) для вяселля.

Раніцаю ў дзень вяселля да будынка маладой прастуе гаманлівы натоўп на чале з жаніхом, святочна прыбраны гірляндамі кветак. На шляху маладога раптам вынікае неспадзяваная перашкода: на парозе дома яго наканай стаяць яе сяброўкі. Іх абдорваюць грашыма і рознымі падарункамі, даюць таксама залаты ланцужок для нявесты. Чым шчадрэйшы малады, тым весялейшае свята.

Дом нявесты запаўняюць госці. Самае пачэснае, цэнтральнае месца маленькіць маладым. Іх падводзяць з розных канцоў паноя адно да аднаго: яны, узяўшыся за рукі і пакланіўшыся гасцям, займаюць сваё месца. Самы паважаны госць абвязвае іх доўгім белым палотнішчам — сімвалам уступлення ў шлюб. На скрыжаваныя рукі маладых льюць ваду; астролаг, «пона», гаворыць палкі маналог, у якім заклікае маладых прайсці праз усё жыццё, не разяднаўваючы рук. Шлюбная цырымонія заканчваецца «сумеснаю ядою»; малады і маладая парэнны з'есці па жменьцы рысу, узятаму з адной місні. Госці абсыпаюць маладых і саміх сябе сухім рознакаляровым рысам: «Хай дастатак не пакідае нас і ў гэтым доме!». Увечары свята ператвараецца ў гаманлівую людную бяседу з феерверкамі, скокамі, песнямі.

Маладыя нежанатыя хлопцы парушаюць спакой маладых, кідаючы на дах іх будынка каменне, вымагаючы «геба» — грошай на развагу. На дапамогу маладым спяшаюцца бацькі, зноў раздаюць грошы і падарункі. Свята доўжыцца некалькі дзён.

Паводле старадаўняга звычаю шлюбная цырымонія пачынаецца ў Індыі ў той час, калі будучая маладая пара грэецца яшчэ ў пясочку. Бывае, што дзеці зусім не ведаюць адно аднаго, часта нават жывуць у розных вёсках. Бацька дзяўчынкі запрашае да сябе ў дом гхатачаў—сваталь. За іх паслугі яму даводзіцца плаціць нямала грошай і дарыць дарагія рэчы. Гхатукі шукаюць жаніха. Уся цяжнасць у тым, каб хлопчык і дзяўчынка належалі да адной касты. Пад час заручын бацька нявесты наведвае будучых родзічаў і ўручае ім грошы — задатак за жаніха. На святкаванні заручын адбываецца першае знаёмства дзесяці-трынаццацігадовых дзяцей. Дзецям звязваюць рукі гірляндамі духмяных кветак і кропляць галовы вадою з Ганга. Цяпер ніхто не можа разарваць сімвалічных ланцугоў, якімі звязана доля дзяцей.

Калі дзеці падрастуць і бацька жаніха палічыць, што настаў час пагаварыць пра вяселле, ён надзявае сваё самае лепшае адзенне і ідзе да «аракула», вясковага «вучонага-мудраца». Той, паважаючы на зорках, прызначае дзень вяселля.

Маладыя пасяляюцца ў доме жаніха. У Індыі, як правіла, жывуць аб'яднаную сям'ёй: моцныя сямейныя сувязі — аснова дабрабыту. Стварэнне аб'яднанай сям'і, дзе жывуць дзед, бацька, сыны, унукі, праўнукі, знаменна аблягчае існаванне ўсіх пяці пакаленняў. На чале сям'і стаіць старэйшы па гадах мужчына. Вядома, галоўнаю гаспадыняю ў доме лічыцца старэйшая па гадах жанчына.

Да таго, як нарадзілася ўсемагутная капіталістычная рэклама, вясельныя абрады брытанцаў вельмі адрозніваліся адзін ад аднаго. На Брытанскіх астравах, акрамя англічан, жывуць шатландцы, ірландцы, горцы Уэлса. Розныя іх мовы, розныя і звычаі, традыцыі. Ды сучасны век—век тэлебачання і кіно—сцёр гэтыя асаблівасці. Дзе купіць пярсцёнак, вянчальнае плацце, куды паехаць у вясельнае падарожжа,—пра ўсё раскажа рэклама, якая суправаджае англічаніна ўсюды—на вуліцы, у кінатэатры, дома ля тэлевізара ці радыёпрыёмніка. Калі няма патрэбнай сумы грошай, каб купіць пярсцёнак ці плацце, вазьміце іх напракат.

І ўсё ж вяселлі ў Англіі бываюць розныя. Мільёны фунтаў стэрлінгаў затрачваюць фінансавыя варацілы Сіці на банкеты, дзе аб'яўляюць пра заручыны, і на раскошныя вяселлі. Але гэтыя вяселлі не паказваюць па тэлевізару. Біржавыя і інтымныя справы мільянераў не вельмі намагаюцца папулярызаваць.

Большасць англічан вянчаецца ў царкве, хаця для атэістаў законам дазволены грамадзянскія шлюбы з рэгістрацыяй у паліцэйскім упраўленні. Англійская царква ўстанавіла свой рытуал вянчання. Імёны маладых павінны быць аб'яўлены пад час нядзельных малітваў. Праз тры тыдні можна вянчацца м'ж восьмаю гадзінаю раніцы і шостаю гадзінаю вечара на працягу трох месяцаў.

Шлюб у Англіі лічыцца несапраўдным, калі:

а) адзін з тых, хто ўступае ў шлюб, разведзены і пасля разводу не мінула шасці месяцаў;

б) адзін або абое тых, хто ўступае ў шлюб—лунацікі (законы пра гэта прынятыя ў 1811 годзе);

в) маладыя не дасягнулі 16 год;

г) парушана цырымонія царкоўнага шлюбу;

д) наяўнасць блізкага радства па крыві;

е) ён або яна змушаны вянчацца сілаю ці ашуканствам;

ж) калі жаніх пад час вянчання быў п'яны да страты памяці.

На вяселлі ў айсораў (адна з народнасцей, якая жыве ў Іране) жаніх аб'яўляецца «царом». Яго сябры—«каты»—па чарзе падводзяць да яго юнакоў, што прысутнічаюць на вяселлі. І «цар» кожнаму з іх назначае кару, штраф.

У канцы вясельнай бяседы «цара» скідаюць. Яго сам прадаецца з аўкцыёна. Грошы, вырученыя пры гэтым, а таксама атрыманыя як штраф, ідуць на пакрыццё страт на вяселлі.

Іранская дзяўчына можа выходзіць замуж, калі ёй мінае дзесяць-трынаццаць год. Жаніх таксама не на многа старэйшы—15—16 год. Бацька юнака павінен даць дзяўчыне «махр»—грошы, каб забяспечыць яе будучыню. Потым унесці «шыр бехаа»—плату за малако нявесцінай маці. Калі меркантыльны бок справы закончаны, адбываюцца заручыны «шырыні харан» —паяданне ласуначаў. Заручыны— «аку» — праводзяць два мулы, па адным з кожнага боку.

Афганскае вяселле гуляецца тры дні. На другі дзень нявесту траба адвезці на кані або на вярблюдзе ў дом да маладога. Калі нявесту выводзяць з яе дома, жаніх павінен абуць яе ў сандалі, а яна пры гэтым супраціўляецца.

Ды вось жартаўлівая «сямейная сварка» закончана. Маладая сядзіць верхам на кані. Лічыцца добраю адзнакаю, калі каму пашанцуе прайсці пад павадамі каня нявесты. Асабліва намагаюцца дакрануцца тых павадоў ворагі жаніха, калі хочуць з ім памірыцца. Убачыўшы, што найлюцейшы вораг дайбрануўся павадоў, малады падыходзіць да яго і па-сяроўску працягвае руку. Такі ўжо дзень гэта, дзень усёдаравання.

Юнак з аргенцінскага племені індзейцаў тэхуэльчэ пасылае да нявесты свайго брата альбо сябра, які прапаноўвае ёй каня ці срэбны ланцужок. Калі дзяўчына прымае падарункі, значыць яна згодна стаць жонкаю.

Каб шлюб быў шчаслівы, а жыццё бясхмарным, малады забівае аднаго са сваіх коней. Яго галаву, хрыбет, хвост, сэрца і пячонку нясуць на бліжэйшы пагорак, дзе аддаюць у ахвяру злому духу Гуалічу. Пасля гэтага рытуалу можна пачынаць вяселле.

Хазарэйцы, адна з афганскіх народнасцей, пачынаюць таргавацца яшчэ да вяселля, больш як за год да яго. Калі бацькі будучай пары дамаўляюцца пра тое, што вяселле ў прынцыпе адбудзецца, яны абменьваюцца хусткамі і разбіваюць на кавалачкі вялікі дроб цукру, і абдзельваюць кавалачкамі ўсіх прысутных. Гэты абрад называецца «кантышкені».

Услед за гэтым выходзяць бацькі і, прачытаўшы разам першы раздзел карану, абмяркоўваюць размеры налыму. Гэта доўгі і зацяты гандаль.

Сама цырымонія вяселля адбываецца толькі праз год. Нявесту апранае «шчаслівая жанчына»—багатая, у якой многа дзяцей. З прым

РУКІ ЗАЛАТЫЯ

Песня пра рукі маладыя, якія народ «рукамі залатымі назавё», не гуляць тут з рапрадуктара. Але словы яе жывуць у душы, калі пераходзіш ад экспаната да экспаната ў гэтай зале. Сапраўды, якія ўмелыя, залатыя рукі ў будучых рабочых! Вось мадэль трактара, які з дапамогаю электратоку тут жа, на вачах, выконвае «сельскагаспадарчыя работы», а вось трэнажор — сапраўдная электронная машына для індывідуальнага праграміравання навучання... Усяго на рэспубліканскай выстаўцы тэхнічнай творчасці навучэнцаў прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, адкрытай да 25-годдзя працоўных рэзерваў у мінскім Палацы спорту, паказваецца звыш 600 экспанатаў. Іх з ахвотай паглядзелі ўжо многія мінчане.

Фота М. ШМЕРЛІНА.

ЭКСПЕДЫЦЫЯ ПА ТАЛЕНТЫ

Васемнаццаць ленінградскіх музычных работнікаў абʼездзілі сёлета тэрыторыю СССР, роўную па сваёй велічыні Італіі і Аўстрыі, разам узятых. Яны падарожнічалі на самалётах, у цягніках, аўтобусах, на выпадковых машынах і проста пехатою, забіраючыся часам у далёкія куткі паўночна-заходніх абласцей краіны.

Ленінградцы прысутнічалі на раённых школьных аглядах мастацкай самадзейнасці, але больш за ўсё сустракаліся з дзецьмі дашкольнага ўзросту, якім сёлетняй восенню трэба было сесці за парту. Сямігадовыя малыя з прыемнасцю дэманстравалі тое, што яны ўмеюць: чыталі вершы, спявалі песні, адбівалі такт пад музыку, запаміналі новыя мелодыі. Так былі знойдзены дзеці, якія валодаюць бясспрэчнымі музычнымі здольнасцямі.

55 дзяцей са згоды бацькоў былі прывезены ў Ленінград і залічаны ў спецыяльны дзіцячы дом музычнага выхавання імя Рымскага-Корсакава. Большая частка навічкоў паступіла ў першы клас. Яны паспелі разам са сваімі будучымі педагогамі частку лета пражыць ля возера ў прыгарадным лагеры навучальнай установы, пазнаёміцца тут з рознымі музычнымі інструментамі. У лагеры наладжваліся канцэрты-загадкі, музычныя гульні, была пастаўлена музычная казка «Перніковая хатка». Усё гэта памагло лепш пазнаць будучых выхаванцаў, іх характар, схільнасці. Цяпер ужо ясна, што Надзя Цюкачова будзе займацца па класу фартэпіяна, Валодзя Маржынскі — па класу духавых інструментаў, Віця Лунін выбраў скрыпку, Коля Суцін — баян.

У гэтай своеасаблівай навучальнай установе 315 выхаванцаў. Дзеці жывуць і займаюцца ў вялікім чатырохпавярховым будынку. Яны развіваюць і свае музычныя здольнасці, і вывучаюць усё тое, што праходзяць іх аднагодкі ў звычайных школах. Скончыўшы вучылішча, яны атрымліваюць пасведчанне аб тым, што маюць права выкладаць спевы і музыку ў звычайных школах. Зрэшты, самыя таленавітыя ідуць далей. Два сёлетнія выпускнікі скрыпач Барыс Шчучкін і кантрабасіст Анатолій Рыбакоў паступілі ў Ленінградскую кансерваторыю.

Навічкам-першакласнікам давядзецца вучыцца 11 гадоў. Усе гэтыя гады будуць запоўнены музыкаю. Тут ёсць свой сімфанічны аркестр і два духавыя, ансамбль скрыпачоў і акадэмічны хор. Наладжваюцца конкурсы на лепшае выкананне твораў Чайкоўскага, Шапэна, Рымскага-Корсакава. Кожны год у дзіцячы дом з задавальненнем прыходзяць госці — кампазітары і музыканты-выканаўцы.

На стале ў дырэктара Раісы Жытомірскай ляжыць сціплы альбом. У ім нямала запісаў на розных мовах свету. Адзін з членаў аўстрыйскай дэлегацыі дзеячоў культуры Хейнц Заслаўскі так сфармуляваў сваё ўражанне ад навучальнай установы: «Усё, што мы там убачылі, можа служыць крытэрыем дзейнасці гуманізму, які ажыццяўляецца ў Савецкім Саюзе... Венскі сімфаніст Кауфман быў узрушаны цудоўнай ігрой дзяцей... Там не было «зорак» і спецыяльна падрыхтаваных вундэркіндаў, а толькі таленавітыя, акружаныя любоўю вучні, кожны з якіх іграў пасвойму добра, паказваючы сваю індывідуальнасць і агульнае для ўсіх натхненне».

Алена ДАРАШЫНСКАЯ.
(АДН).

АПОШНІ ЦУД ДЗІАНІСІЯ

На ўвесь свет вядомыя творы старажытнарускага мастацтва — іконы Андрэя Рублёва, храмы Крамля, Ноўгарада. А мастацтвазнаўцы адкрываюць усё новыя і новыя выдатныя помнікі старыны. АДН прапануе ўвазе чытачоў нарыс Сяргея Разгонава, які расказвае пра паездку ў адну з папулярных сёння «турыстычных Мек» — Ферапонтава.

Першаадкрывальнік дзіанісіевых фрэсак мастацтвазнаўца Васілій Георгіеўскі напісаў: «Нам пашанцавала знайсці ў глухім кутку Наўгародскага краю, паўзабытым старажытным Ферапонтавым манастыры фрэскавы роспіс, які захаваўся амаль цудам...»

Адкрыццё Георгіеўскага стала падзеяй. Не спыняючыся, ідзе сюды паток энтузіястаў, каб дакрануцца да «дзіўнага дзіва», услухацца ў шорах ферапонтаўскіх ліп, прачытаць на сафіце паўночных дзвярэй Раждзественскага сабора стараславянскую вязь: «А пісцы Дзіанісій іконнік са сваімі чады...» Гэта сапраўды подпіс самога Дзіанісія — аднаго з трох карыфеяў старажытнарускага жывапісу.

Як трапілі гэтыя фрэскі ў далёкае сяло?

У 18 «попрышчах» (кіламетрах) ад старажытнага гарадка Кірылава раскінулася на беразе Барадаўскага возера сяло Ферапонтава.

Сюды, у Ферапонтаў манастыр, каля 1500 года прыйшоў з Масквы «прыгожы і хітры» жывапісец Дзіанісій са сваімі сынамі Феадосіем і Уладзімірам. За плячыма Дзіанісія быў ужо доўгі шлях, нямала слаўных спраў зрабіў ён, распісваючы саборы па ўсёй праваслаўнай Русі.

Але шасцідзесяцігадовы мастак, які паспытаў славы ў сталіцы, вырашыў пад старасць пайсці ў гэты глухі куток паўночнай зямлі. Мясцовая народная легенда расказвае, што ў Дзіанісія памерла жонка Кацярына, якую ён кахаў з усёй сілай узвышанай душы. Яе смерць узрушыла мастака настолькі, што ён доўгі час нічога не пісаў, адаючыся ўспамінам і безвыходнаму смутку. У Маскве ўсё нагадвала яму пра каханую, і ён пасля нядоўгага роздуму паехаў на Поўнач, дзе «начата бысть подписывати» царкву Раждзяства багародзіцы.

Доўгія гады ў Раждзественскім саборы не было царкоўных служб, ён лічыўся «халодным» храмам. Можа быць, дзякуючы гэтаму фрэскі Дзіанісія захаваліся ў сваёй першапачатковай прыгажосці, быццам учора майстар закончыў роспіс.

Хоць фрэскі Дзіанісія захаваліся добра, яны мелі патрэбу ў частковай рэстаўрацыі, якая была нядаўна праведзена маскоўскім майстрам Васілём Кірыкавым, які ў свой час прымаў удзел у рэстаўрацыі рублёўскай «Троіцы».

Роспіс храма Раждзяства прысвечаны так званай акафістнай тэме — услаўленню Маці. Глыбіню мацярынскага пачуцця, пакуты, любоў і разуменне вышэйшых мэт жыцця выказаў Дзіанісій у вобразе Маці. У мільгаючых пералівах фрэсак адчуваецца настрой прасветленага смутку і чысціні, уся кампазіцыя падпарадкавана гэтаму настрою, які з асаблівай сілай праяўляецца ў алтарным ніку Маці. Яна глядзіць на вас выпрабавальна і ўмольна, даруючы і просячы літасці адначасова, у ёй невыказная словамі ўлада любві і жаноцкасці; ад яе позірку не ўцячы і не схавацца нікуды, ён сустракае вас ля ўваходу і сочыць усюды. І верыш народнай легендзе пра гібель жонкі мастака, і зразумееш, што ў вобразе Маці ён уславіў зямную каханую жанчыну, маці сваіх сыноў.

Фарбы фрэсак самых тонкіх і высакародных адценняў: светла-блакітныя, як вада ў азёрах, пяшчотна-зялёныя, як схілы ферапонтаўскіх пагоркаў, дымчата-фіялетавыя, як летнія закаты над частаколам яловых вершалін... Дзіанісій знаходзіў гэтыя фарбы тут жа, у ваколіцах Ферапонтава, каб адлюстраваць імі на скляпеннях храма свой смутак і любоў — сваю лебядзіную песню...

Сяргей РАЗГОНАЎ.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ МЕДЫЦЫНЫ І АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

Восем тысяч дакументаў і экспанатаў сабрана для музея гісторыі медыцыны і аховы здароўя, які ствараецца на грамадскіх асновах пры Мінскім медыцынскім інстытуце. Ён адлюструе развіццё медыцыны ў Беларусі за два апошнія стагоддзі. Атрыманы цікавыя матэрыялы аб стварэнні ўрачэбных упраў у беларускіх губернях Расіі, адкрыцці бальніц і аптэк, аб барацьбе з лютымі эпідэміямі.

Асноўная частка экспазіцыі адводзіцца развіццю медыцыны і аховы здароўя пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У гэтым раздзеле музея наведвальнікі знойдуць дадзеныя аб росце ў рэспубліцы сеткі бальніц, урачэбных участкаў, радзільных дамоў і паліклінік. У матэрыялах аб развіцці медыцынскай адукацыі найбольш поўна адлюстроўваецца гісторыя Мінскага медыцынскага інстытута.

БЕЛТА.

Ля адной міскі...

Фотаэцюд нашага чытача С. ДАРОЖКІ (Любань).

ЦЯЖАР ГРЫБНОГА СЕЗОНА

Нядаўнія моцныя дажджы ў Італіі выклікалі надзвычай багаты ўраджай грыбоў у паўночных раёнах краіны. Гэта прывабіла сюды мноства грыбнікоў — яны прыязджалі на аўтамабілях і цягніках, ішлі пехатой з бліжэйшых населеных пунктаў. Аднак уласнікі зямельных участкаў, дзе выдаўся ўраджай грыбоў, назвалі наплыў грыбнікоў «новым нашэсцем варвараў». І ў іх былі падставы сказаць так. Мэр мястэчка Брычаразіо, размешчанага на захад ад Турына, заявіў з гэтай прычыны, выступаючы ў камунальным савеце: «Грыбнікі, як саранча, пранікаюць усюды, асабліва па нядзелях. Яны перакапваюць зямлю, ломяць, крадуць усё, не толькі збіраюць грыбы, але і выкрадаюць фрукты ва ўласнікаў садоў».

Землеўласнікі ўсімі сродкамі стараліся перашкодзіць «нашэсцю». У некаторых месцах адбыліся сутычкі паміж грыбнікамі і ўласнікамі зямельных угоддзяў. Апошнія зрабілі на многіх дарогах загароды, каб не даць магчымасці аўтамашынам праехаць да месц, багатых грыбамі.

У паліцыю і органы мясцовага самакіравання пачалі паступаць просьбы вынесці пастановы, якія б абаранялі землеўласнікаў ад «нападу грыбнікоў». У некаторых раёнах жыхары самі паспрабавалі ўстанавіць нейкі парадак. Ля Пармы камунальны савет адной з вёсак забараніў пабочным асобам паяўляцца на тэрыторыі ваколі вёскі і нават для мясцовых жыхароў устанавіў плату за збор грыбоў у лясах у памеры 350 лір.

В. ГАЛАВІН.
(ТАСС).

ЧАСОПІС «СМЕНА», ГОД 1966

Карэспандэнт Агенцтва друку Навіны звярнуўся да галоўнага рэдактара літаратурна-мастацкага і грамадсна-палітычнага часопіса «Смена» Уладзілена Самохіна з просьбай расказаць пра найбольш цікавыя матэрыялы бліжэйшых нумароў і пра планы рэдакцыі на 1966 год. Вось што ён паведаміў.

Чытачы «Смены» прынялі самы актыўны ўдзел у нашай «Размове пра каханне», якая вядзецца ў «Дыскусійным клубе «Смены». У кастрычніку мы надрукуем вялікую падборку пісем чытачоў, думаем, што гэтая падборка будзе не адзіная. Зацікавілі чытача і нашы дыскусійныя выступленні аб праблемах вышэйшай адукацыі. У новым годзе ў «Дыскусійным клубе» пойдзе гаворка аб тым, што такое шчасце і што такое «лёгкае жыццё», мы думаем паспрачацца аб праблемах маладой літаратуры і аб многім іншым.

Цікавыя выступленні рыхтуе рэдакцыя ў рубрыках «Галерэя шэдэўраў», «Старонка маленькіх сустрэч», «Бумеранг», «Альбом кур'ёзаў». У кожным нумары мы збіраемся публікаваць матэрыял пад рубрыкай «Тайны XX стагоддзя». Такое жаданне чытачоў, якіх вельмі зацікавілі тайны нерастлумачаных «цудаў» неверагоднага возера Фундудзі, не знойдзеных яшчэ скарбаў і многае іншае. На старонках «Смены» будуць рэгулярна «працаваць» завочныя курсы разумовай гімнастыкі.

У наступным годзе мы мяркуем надрукаваць серыю матэрыялаў, якую ўмоўна можна назваць «Барацьбіты за вялікую справу». Гэта будуць мастацкія нарысы пра буйнейшых рэвалюцыянераў розных часоў і народаў. Стануць рэгулярнымі дарожныя нарысы савецкіх пісьменнікаў і журналістаў, якія пабывалі ў розных краінах свету. Калі гаварыць пра літаратурныя творы, дык у наступным годзе ніводзін нумар часопіса не выйдзе без прыгодніцкай або навукова-фантастычнай аповесці, апавядання, навелы. Сёлета ж «Смена» публікуе новую прыгодніцкую аповесць Аркадзя Адамава «След лісіцы». Свае новыя творы навукова-фантастычнага і прыгодніцкага жанру перадаюць «Смене» польскі пісьменнік Збігнеў Нянацкі, савецкія пісьменнікі Аркадзь Адамаў, Анатоль Дняпроў, Раман Кім.

«Смене» таксама абяцалі свае новыя работы празаікі Ю. Казакоў, Ул. Амлінскі, Г. Сямёнаў, А. Гладзілін, Ул. Салаўхін, Л. Ліхадзеєў, В. Канецкі, А. Адамаў, А. і Б. Стругацкія, паэты Э. Межалайціс, А. Межыраў, Б. Слуцкі, Я. Вінакураў, Р. Раждзественскі, Ул. Цыбін, Н. Мацвеева, Т. Жырмунская. Зрэшты, усіх аўтараў часопіса пералічыць проста немагчыма. Скажу толькі, што ў «Смене» 1966 года будзе надрукавана некалькі аповесцей, больш сарака апавяданняў, артыкулы, аб'яднаныя рубрыкай «Літаратурныя партрэты». У кожным нумары часопіса паранейшаму будзе публікавацца новая песня з нотамі.

Рэдакцыя рыхтуе вялікі цыкл артыкулаў і нарысаў пра найвышэйшы дасягненні савецкай і зарубежнай навукі, пра смелыя, няхай сабе і спрэчныя, навуковыя гіпотэзы і здагадкі. Больш будзе ў часопісе спартыўных матэрыялаў. Мы раскажам і пра вядомых спартсменаў, і пра буйныя падзеі ў спорце. Нашы матэрыялы памогуць стаць дужымі і здаровымі тым, хто яшчэ не далучыўся да фізкультуры і спорту, але хоча гэта зрабіць. Як і раней, «Смена» будзе рэгулярна расказваць пра новыя мадэлі адзення, пра тое, як можна без вялікіх затрат зрабіць прыгожым і модным сваё адзенне, утульным і сучасным свой пакой.

Словам, «Смена» пастарэецца і надалей быць часопісам-субяседнікам, часопісам-сябрам, які можна прачытаць не толькі з цікавасцю, але і з карысцю.

АДН.

ГОРАД НАД ФАНТАНАМІ

«Жамчужына мастацтва», горад-помнік... Сусветна вядомы Петрадварэц, адзін з цудоўных ленінградскіх прыгарадаў.

Пасля вайны вырас новы Петрадварэц, які жывапісна размясціўся сярод гарадскіх паркаў. Горад расце далей. Перспектыўны план яго развіцця распрацаваны ў майстэрні № 1 інстытута Ленпраект.

Ужо праз некалькі гадоў, піша газета «Ленінградская правда», агульная плошча паркаў дасягне 1 000 гектараў (на 200 гектараў больш, чым сёння). Мярнуецца аднавіць так званыя пейзажныя парні ў раёне Ружовага павільёна, Бельведэра, Заечага рэмізу, Царскага млына. А па суседству стануць новыя гасцініцы, базы аднадзённага адпачынку, пансіянаты, матэлі. Разам яны адначасова прымуць каля дзевяці тысяч адпачываючых.

У раёне размясціцца студэнцкі гарадок Ленінградскага універсітэта імя А. А. Жданава. Абсталяваныя па апошнім слове тэхнікі лабараторныя карпусы, прасторныя аўдыторыі і кабінеты, кіназалы, спартыўныя комплексы, студэнцкія інтэрнаты — усё гэта зойме вялікую плошчу ў раёне Старога Пецяргофа.

Петрадварэц будучыні разлічаны на 50 000 жыхароў. Новы цэнтр яго размясціцца паміж Самсоніеўскім каналам і вуліцаю Камінтэрна — на беразе Вольгінскага става. У бок Англійскага парку адсюль пойдзе новая магістраль — бульвар Разведчыкаў. Для разгрузкі цэнтральных магістралей ад транспарту паралельна з чыгункаю пройдзе новая вуліца. Вызваленыя ж ад патоку машын Красны праспект стане прагулачнай магістраллю.

АДН.

ВЫХОДЗЯЦЬ НА ЭКРАНЫ

ФІЛЬМЫ ГЭТАГА МЕСЯЦА

«Святло далёкай зоркі» — так называецца новая двухсерыйная шырокаэкранная мастацкая кінакарціна, створаная на студыі «Масфільм» па матывах аднайменнай аповесці Аляксандра Чакоўскага.

— Наш фільм, — гаворыць рэжысёр-пастаноўшчык Іван Пырʼеў, — пра тое, які ёсць, які павінен быць савецкі чалавек.

Шмат падзей, шмат людскіх жыццяў пройдзе перад гледачамі на экране. Шукаючы Олю, якая быццам бы загінула на вайне, але пазней аказалася жывой, герой фільма Заўялаў сустракаецца з людзьмі розных узростаў і прафесій. Мы імкнуліся да таго, каб на экране ўзнікла шыроная карціна жыцця эпохі, азмрочанай несправядлівасцямі, звязанымі з культам асобы, якія не пахіснулі, аднак, жыватворчых асноў нашага грамадскага ладу, маральна-палітычнага адзінства народа, яго волі, яго энергіі да будаўніцтва камунізма. Адсюль нашэ галоўная задача — раскрыць вобразы, характары ўсіх шматлікіх персанажаў карціны.

У ролі Заўялава здымаўся артыст МХАТа Мікалай Аляксееў. Олю іграе маладая актрыса Маскоўскага драматычнага тэатра імя Станіслаўскага Ліннела Скірда. Сярод іншых акцёраў, занятых у фільме, — Андрэй Абрыкосаў (генерал Асокін), Вольга Віклант (мадам Каламійцава), Яўгеній Веснік (Сіманюк), Аляксей Баталаў (сакратар гаркома), Софʼя Піляўская (Прохарава) і іншыя.

У кастрычніку на экраны рэспублікі выпускаецца новая кіналяровая кінакарціна «Цені забытых продкаў» — па славутаму твору класіка ўкраінскай прозы М. Кацюбінскага. Рэжысёрам С. Параджанавым і аператарам Ю. Ільенкам, якія працуюць на кінастудыі імя А. Даўжэнкі, клапатліва захаваны каларыт легенды, складаная стылістыка твора. У фільме шмат тонкіх знаходак, якія з небывалай паэтычнай сілай раскрываюць драматычны лёс Івана і Марычкі. У галоўных ролях заняты акцёры Е. Алісава, В. Мікалайчук, К. Кадачнікава, А. Гай і іншыя.

...Валодзя працаваў майстрам-фасадчыкам у брыгадзе Дзямёнція Бляхіна. У жыцці яго ўсё было ясна і проста: ён любіў сваю работу, умеў працаваць, імкнуўся больш зарабіць і жыў лёгка і весела. Але... Што адбылося аднойчы, гледачы даведаюцца, паглядзеўшы новую мастацкую кінааповесць «Каханая», створаную рэжысёрам Рычардам Вінтаравым на студыі «Беларусьфільм» па матывах рамана Мікалая Пагодзіна «Янтарныя каралі». У фільме здымаліся А. Назарава, В. Саломін, В. Броўкін, С. Дружына.

«Патокі крыві, пралітыя 9 студзеня, патрабуюць расплаты, — так пісаў у далёкі Пішпек сваёй маці дзевятнаццацігадовы студэнт політэхнічнага інстытута Міхаіл Фрунзе. — Дарога вызначылася». У гэтых кароткіх радках — цвёрдасць перакананняў, нязломная воля барацьбіта, сіла характару, рашучасць чалавека, які назаўсёды вызначыў свой цяжкі шлях. Першае баявое хрышчэнне малады Фрунзе атрымлівае ў горадзе тэкстыльшчыкаў Іванава-Вазнясенску. Тут разгарэлася полымя барацьбы, тут былі створаны першыя Саветы рабочых дэпутатаў — правобраз Савецкай улады. Зусім яшчэ юны Фрунзе стаў адным з кіраўнікоў паўстання. Пра гэты параўнаўча мала асветлены ў мастацтве этап біяграфіі выдатнага бальшавіка-ленінца і расказвае новы мастацкі фільм «Таварыш Арсен», пастаўлены рэжысёрам І. Лукінскім на Маскоўскай кінастудыі імя М. Горкага па сцэнарыі А. Васільева. У ролі М. В. Фрунзе — артыст Раман Хамятаў.

У кастрычніку выйдзе на экраны новая ўзбекская кінааповесць «Зорка Улугбека». Аўтар сцэнарыя Мансуд Шэйх-задэ, рэжысёр-пастаноўшчык Лаціф Файзіеў.

Будуць таксама дэманстравацца новыя мастацкія кінакарціны «Ад сямі да дванаццаці» (кінастудыя «Масфільм») і «Капітан Нуль» (Рыжская кінастудыя).

З зарубежных кінафільмаў гледачы змогуць паглядзець: «Попел і алмаз» (Польшча), «Старыя на ўборцы хмелю» (Чэхаславакія), «Чорны аксаміт» (ГДР), «Вір» (Югаславія), «Чужы ў горадзе» (Турцыя), «Сунічная паляна» (Швецыя), «Акцёр» (Англія), «Чатыры дні Неапаля» (Італія).

Кадры з фільмаў: «Любімая», «Цені забытых продкаў», «Чатыры дні Неапаля».

СТО РОЛЯЎ Сяргея Марцінсона

У ПЕРШЫНЮ ён выйшаў на сцэну ў маленькім петраградскім тэатры «Вольнай камедыі» ў блакітных балетных пачках, са снопам жоўтых кудзеркаў на галаве. Мякка ступаючы, грацыёзна раскланьваючыся, ён зусім прафесіянально паказваў няўдалую балерыну, якая ўвесь час спатыкаецца, падае, усхопліваецца і зноў нязграбна спатыкаецца на пуантах.

А праз год Сяргей Марцінсон паявіўся на кінаэкране ў фільме Рыгора Козінцава і Леаніда Траўберга «Прыгоды Акцябрыны» (1924 г.) у ролі Куліджа Керзанавіча Пуанкарэ. У цылінды, з муаравай стужкай цераз плячо і вузенькіх кароткіх штанах, ён узнікаў у самых галавакружных ракурсах.

Малады акцёр хутка заваяваў папулярнасць эксцэнтрыка, майстра вокамгненнага пераўвасаблення.

У час парыжскіх гастроляў Тэатра Меерхольда ў 1930 годзе Марцінсон выступаў у ролі Хлестакова. Акцёр стварыў значны і глыбокі вобраз. У асноўным ён выкарыстаў вонкавыя прыёмы ігры, якія білі на эфект. Захопленыя парыжане не абмінулі ўвагай дзівосную тэхніку Марцінсона, разнастайнасць рытмаў руху, уменне акцёра паказаць самыя разнастайныя адчуванні свайго героя. У сцэне ап'янення, напрыклад, ён з усіх сіл стараецца давесці, што цвярозы, а ў славутай сцэне хлусні захапіў усіх фантастычна бязглуздым танцам з жонкаю гараднічага.

Але вопытныя тэатралы ўжо тады зразумелі, што Марцінсон нічога не робіць дарэмна, што кожны эксцэнтрычны прыём памагае акцёру раскрыць сутнасць вобраза, стварыць яркі выразны характар, данесці да гледача ідэі, закладзеныя аўтарам.

У тыя гады пра Марцінсона зусім справядліва пісалі, што ён умее грыміраваць не толькі твар, але і рукі, ногі, усю фігуру. Сапраўды, рэдка хто з акцёраў умее так падпарадкаваць сабе цела: то зрабіць так, каб рукі бязглузда матляліся, доўгія, як у малпы, то зрабіць іх карантышкамі, імітаваць бясконцую разнастайнасць хады. Усё гэта цудоўна выкарыстоўвалася артыстам для стварэння вострасатырычных сацыяльна накіраваных вобразаў.

Эксцэнтрык у ролі сатырыка. Гэта амплуа прыпісвалася Марцінсону як вяршыня яго магчымасцей. Але арыгінальны і шматбакова таленавіты акцёр часта паказваў сябе зусім нечакана.

...У снежні 1940 года сталічныя афішы паведамілі, што ў пастаўленым на сцэне Тэатра імя Рэвалюцыі спектаклі «Беспасажніца» (па п'есе А. Астроўскага) драматычную ролю Юлія Карандышава будзе выконваць Сяргей Марцінсон.

У гэтай ролі артыст выступаў як майстар своеасаблівай і праўдзівай псіхалагічнай игры. Ён глыбока пранікаў ва ўнутраны свет трагікамічнага героя. Яго Карандышаў быў блізкі да тых маленькіх людзей, пра якіх расказаў свету Мікалай Гогаль. Гэта быў абяздолены чыноўнік з хваравітай самалюбнасцю і затоенымі ганарлівымі марамі. Марцінсон сыграў сумную аповесць аб велічы пакут зняважанага і растаптанага кахання. Фінальная сцэна драмы. Ларыса, нявеста Карандышава, адмаўляе свайму жаніху. Мары аб нерэальным шчасці засталіся для Карандышава пустымі марамі, і куля, пушчаная ў Ларысу, — бяссільная помста Карандышава. Гэта быў бунт прыніжанага і зняважанага чалавека супраць грамадства, якое нарадзіла адносіны, дзе ўсё прадаецца, нават пачуцці, дзе купля-продаж замяняе сапраўднае каханне.

Вобраз Карандышава, створаны Марцінсонам, быў прасякнуты глыбокай чалавечнасцю. Выкрываючы смешнае ў чалавеку, ён спачуваў яму, абвінавачваючы — апраўдваў.

Крытыкі аднадушна прызналі: рэжысёр спектакля Юрый Завадскі нанава адкрыў гледачу Марцінсона, а Марцінсон нанава адкрыў Карандышава.

На экраны выйшла вялікая колькасць фільмаў з удзелам Сяргея Марцінсона. Даволі, напрыклад, назваць такія створаныя ў розны час карціны, як «Подзвіг разведчыка» і «Сільва», «Ілья Мурамец» і «Ідыёт», «Чарнаморачка» і «Залаты ключык», «Ноч перад Калядамі» і «Манет». Ролі, сыграныя ў гэтых карцінах артыстам, розныя па сваім характары, вобразнаму малюнку. Але ні адна з іх не заставалася незаўважанай гледачом, не пакінула яго раўнадушным.

Ад фармальнай экспэнтрыкі — да драмы, ад драмы — да сатыры, ад сатыры — да трагікамедыі — такія вехі на складаным шляху акцёра вострай іранічнай думкі і бурнага тэмпераменту, акцёра заўсёды праўдзівага, мэтанакіраванага.

Партрэт акцёра быў бы няпоўны, калі б я не ўспомніў, што некалькі гадоў назад, маючы за плячыма ўжо каля ста роляў, сыграных у кіно і тэатры, Марцінсон упершыню выступіў у вобразе станоўчага героя. Ён зняўся ў фільме рэжысёра Аляксандра Птушко «Чырвоныя ветразі». Яго вугальшчык Філіп, амаль непрыкметны персанаж рамантычнай казкі Аляксандра Грына, выклікаў вялікую цікавасць у рэцэнзентаў і гледачоў. Ён быў зямны, звычайны, будзённы. Але пад вонкава суровым абліччам гэтага вечна закуранага вугальным пылам панурага чалавека, які не ведаў ні цяпла, ні ласкі, угадвалася сэрца, адкрытае добрым людзям, у ім адчувалася мара аб лепшым свеце, аб душэўна прыгожым чалавеку. Ім кіравала нянавісць да ўсялякай несправядлівасці і гатоўнасць заступіцца за кожнага пакрыўджанага і слабага чалавека.

Яшчэ адна стыхія Марцінсона — эстрада, на якой ён пачаў свой шлях у мастацтве і з якой ён не расстаецца і сёння. Вось ён імкліва выбег на сцэну, махнуў кійком, пялёскаў пальцамі, застукаў абцасамі і, падскокваючы лёгка і грацыёзна, праспяваў песеньку, вострую і таропкую, калючую і прыгожую. Такім памятаюць Марцінсона людзі старэйшага пакалення. Такім бачаць яго людзі новага пакалення.

Сяргей Марцінсон заўсёды ў дарозе. Мала хто з самалёт, каб злётаць на Урал, у Сібір, на Волгу, выступіць на сваім творчым вечары перад гледачамі Цаліннага краю, будаўнікамі Іркуцка, металургамі Свярдлоўска, ажывіць на эстрадзе любімыя вобразы кінаэкрана.

Акцёр поўны планаў і задум. А часу так не хапае! Сёння здымка ў дзіцячым казачным фільме на Кіеўскай студыі. Паслязаўтра — у Тбілісі, дзе ён здымаецца ў востракамедыйнай ролі, а праз тры дні ў Маскве разглядаецца створаны з яго удзелам сцэнарый па вядомай аповесці Дастаеўскага «Дзядзюхнаў сон». Аб трагікамічнай ролі старога князя К., аднаго з герояў аповесці, акцёр марыў шмат гадоў...

Больш за ўсё, па словах Марцінсона, ён любіць гуляць па палях і лясах ціхага Падмаскоўя, плаваць і бегаць імкліва на лыжах у казачным лесе Сярэбранага Бору. Гэта не проста спорт. Гэта ні з чым не параўнаная асалода і душэўная радасць, якая жывіць творчую думку. Шахматы — яшчэ адно моцнае захапленне Марцінсона. Аднак у гэтым, па ўласным прызнанні, акцёру далёка да Ціграна Петрасяна...

У чым сакрэт нязгаснай маладосці і творчай нястомнасці артыста? У тэмпераменце. У жыццялюбнасці. У гарачай любві да мастацтва і імкненні як мага больш паспець зрабіць для яго.

Генрых ШАХАЎ.
(АДН).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

5 кастрычніка

Першая праграма. 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15 — «Табе, юнацтва!» (М). 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Дзецям пра звяранят». Перадача з Ленінграда. 17.30 — для дзяцей. «Я малюю свет». Кінарыс. 17.50 — універсітэт педагагічных ведаў. «Ці ўважлівыя вашы дзеці?» Гутарка кандыдата педагагічных навук А. П. Ерась. 18.20 — тэлевізійныя навіны. 18.40 — «Як глядзець творы мастацтва». Асновы разумення выяўленчага мастацтва (М). 19.05 — В. Кажэўнікаў. «Шчыт і меч». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Першая серыя. Перадача з Ленінграда. 20.15 — «Свет сёння» (М). 20.45 — па вашых просьбах. Канцэрт. 21.25 — пра конкурс сельскіх рацыяналізатараў. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «Ля тэатральнай афішы». Да пачатку тэатральнага сезона ў Маскве (М).

Другая праграма. 17.30 — для школьнікаў. «Маладыя галасы». Канцэрт. Перадача з Днепрапятроўска. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Сельская навіна» (М). 18.40 — героі нашага часу. «Тры таварышы». Кінанарыс. 19.05 — «Дзеці і яблыкі». Тэлевізійны спектакль. 20.45 — «Самацветы». Музычная перадача (М).

6 кастрычніка

Першая праграма. 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15 — «Навіны сельскай гаспадаркі». Кіначасопіс. 16.35 — праграма перадач. 16.40 — для школьнікаў. «Урал — зямля залатая». Перадача з Чэлябінска. 17.00 — для школьнікаў. «Нашы сябры — тэльманаўцы» (М). 17.30 — школьная фільматэка. Для вучняў 9-га класа. «Барыс Гадуноў». Мастацкі фільм. 19.25 — тэлевізійныя навіны. 19.45 — «Нашы інтэрвʼю». 20.15 — «Нестандартны ўраджай». Пра рэалізацыю садавіны і гародніны. 20.45 — «Сёння спектакля няма». Перадача пра маладых акцёраў Тэатра імя Ленсавета. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «У эфіры — «Маладосць». «Арбіта» (М).

Другая праграма. 17.30 — «Навука — вытворчасці» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «На зямлі Салавата». Тэлевізійны дакументальны фільм (М). 18.55 — новыя кнігі (М). 19.00 — С. Гулак-Артэмоўскі. «Запарожац за Дунаем». Спектакль Кіеўскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя Т. Р. Шаўчэнкі. Перадача з Кіева.

7 кастрычніка

Першая праграма. 16.15 — праграма перадач. 16.20 — для школьнікаў. «Паездка ў туманнае». Першая серыя тэлевізійнага фільма «Луў і Лея на канікулах» (ГДР). 16.55 — фінальная сустрача дзіцячых футбольных каманд на кубак Беларускага тэлебачання. 17.45 — «Карбуда». Мультыплікацыйны фільм. 18.25 — тэлевізійныя навіны. 18.45 — узнагароджанне фіналістаў кубка імя Юрыя Гагарына. 18.55 — спартыўная перадача. 19.40 — «Вяселле». Мастацкі фільм. 20.45 — спартыўная перадача (М). 21.30 — «Эстафета навін» (М). 22.25 — канцэрт (М).

Другая праграма. 17.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Умелыя рукі» (М). 17.30 — «Фізкультура і спорт» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Людзі заўсёды ў дарозе». Кінанарыс. 18.25 — «Гутаркі ля раяля». Ф. Шапэн (М). 19.15 — «У рэзерве ў смерці». Мастацкі фільм (М). 20.45 — «Як Джані Скікі трапіў у пекла». Фільм-опера.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ:

г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухг